Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 27 (441) | Нядзеля, 23 ліпеня 1939 года | Цана 20 кап.

КЛАПАЦІЦЦА АБ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Законнымі наследнікамі сонечнай будучыні нашай радзімы, наследнікамі ўсіх заваёў соцыялізма з'яўляюцца нашы шчаслівыя совецкія дзеці. «Ім прадстаіць пажаць плады многіх год гераічнай барацьбы бацькоў і старэйшых братоў і ўвайсці ў комуністычнае грамадства, якое зараз нараджаецца на нашых вачах. Задача састаіць у тым, каб дапамагчы дзецям у накапленні ведаў, выхаваць з іх смелых, чэсных і благародных людзей, здольных завяршыць будаўніцтва велічнага будынка комунізма» («Правда»).

Пачэсная і адказная роля ўскладаецца на совецкую літаратуру. Літаратура мае ў сваім распараджэнні неабмежаваныя магчымасці для таго, каб прывіваць нашым дзецям з самага юнага ўзросту любоў да радзімы, да свайго народа, любоў да працы, чэснасць, храбрасць, пачуццё адказнасці перад калектывам.

Комуністычная партыя, асабіста таварыш Сталін надаюць велізарнейшае значэнне стварэнню добрай дзіцячай кнігі. Таварыш Андрэеў на першай нарадзе па дзіцячай літаратуры пры ЦК ВЛКСМ сказаў: «Надаючы вялікае значэнне дзіцячай літаратуры ў пытаннях выхавання і ведаючы слабасць яе выдання, таварыш Сталін паставіў пытанне аб перадачы гэтай справы комсамолу, які, несумненна, яе лепш арганізуе».

Між тым, у нас у БССР справе стварэння добрай дзіцячай кнігі не аддаецца дастатковай увагі. Сур'ёзна гэтай работай не займаюцца ні Саюз совецкіх пісьменнікаў, ні выдавецтва. Што-ж датычыць ЦК ЛКСМБ, то ён зусім ухіліўся ад сваёй кроўнай, непасрэднай задачы — дапамагаць у стварэнні высокаякаснай мастацкай дзіцячай кнігі. Гэта безадказнасць прывяла да таго, што за апошні час дзеці не атрымалі ні аднаго твора, які-б поўнасцю адпавядаў іх запатрабаванням.

Усё лепшае, што ёсць у беларускай дзіцячай літаратуры — вершы народных паэтаў-ордэнаносцаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, аповесць пісьменніка-ордэнаносца М. Лынькова «Міколка-паравоз», творы Я. Маўра, А. Якімовіча — напісаны два-тры годы назад. Толькі пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля здаў у друк зборнік дзіцячых апавяданняў і напісаў вершаваны твор.

Праўда, трэба адзначыць, што за апошні час у дзіцячую літаратуру прышлі новыя людзі, паявіліся новыя імёны: Пасляднёвіч, Ушакоў, Жаўрук, Стаховіч, Левановіч. Усе гэтыя і другія пісьменнікі працуюць над творамі для дзяцей. Пачынаючы пісьменнік П. Рунец здаў у друк зборнік дзіцячых апавяданняў. Значыць, у нас ёсць людзі, якія працуюць, якія хочуць ствараць сур'ёзныя дзіцячыя творы. Але гэтым людзям ніхто не аказвае сур'ёзнай дапамогі, ніхто не клапоціцца аб іх творчым росце. Вышаўшыя з друку творы не абмяркоўваюцца. А недахопы ў творах маладых пісьменнікаў сустракаюцца вельмі часта. Схематызм, дзяшовая папулярнасць, павярхоўнасць, неглыбокі паказ жыцця — усе гэтыя недахопы можна зжываць лягчэй і хутчэй толькі тады, калі пісьменніку будзе аказвацца неабходная дапамога, калі калектыў укажа, што ў творы добрага, што дрэннага, у якім напрамку пісьменнік павінен ісці наперад.

Нельга не сказаць аб крытыцы. Крытыка наша стаіць яшчэ ў баку ад дзіцячай літаратуры. Мы яшчэ не маем ні аднаго глыбокага крытычнага артыкула аб творчасці беларускіх пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей. Нашы крытыкі, як відаць, недаацэньваюць гэтай важнай і патрэбнай справы, а Саюз пісьменнікаў абыякава ставіцца да гэтага.

У некаторых пісьменнікаў, асабліва маладых, існуе яшчэ думка, што напісаць дзіцячы твор не так ужо і цяжка, што гэта быццам больш лёгкая работа, чым пісаць творы для дарослых. Гэтую, у корані няправільную, думку трэба зжыць. Людзям, у якіх яшчэ жыве падобнае ўяўленне аб дзіцячых творах, неабходна напомніць словы тав. Андрэева, што «... дзіцячыя кнігі ствараць значна цяжэй, чым кнігі для дарослых. Да аўтара дзіцячай кнігі прад'яўляецца цэлы рад дадатковых патрабаванняў».

Трэба заўсёды памятаць, з якой адказнасцю і ўважлівасцю пісалі творы для дзяцей Аляксей Максімавіч Горкі і Уладзімір Маякоўскі. Горкі як ніхто разумеў значэнне і важнасць стварэння добрай дзіцячай кнігі. Ён гаварыў: «Дзеці павінны быць больш культурнымі і яшчэ больш актыўнымі, чым іх бацькі, аснавапаложнікі новага свету». Гэтыя словы Аляксея Максімавіча з асаблівай сілай гучаць сёння, калі перад нашай краінай стаіць велізарная задача комуністычнага выхавання працоўных. Гэтыя словы трэба заўсёды помніць усім работнікам, якія маюць справу з комуністычным выхаваннем дзяцей. І асабліва іх трэба памятаць дзіцячым пісьменнікам.

Пісьменніцкая грамадскасць, ЦК ЛКСМБ, выдавецтва павінны рашуча перабудаваць сваю работу ў справе выдання дзіцячай літаратуры. Мы маем усе магчымасці, каб даць нашым шчаслівым дзецям добрыя творы — аповесці, вершы, песні, п'есы.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Ю. ВІЦЬБІЧ

АПАВЯДАННЕ ШАЎЦА СУРДЗІНА

У семнаццатым годзе, адразу пасля лютаўскай рэволюцыі, выбралі мяне шаўцы нашай майстэрні ў прафком саюза рабочых скуры. Спачатку я адмаўляўся.

— Не справўлюся, сябры, — кажу.— Профсаюз скуры вельмі вялікі — у ім і шаўцы, і загатоўшчыкі, і кажамякі, і шчаціннікі, і каго толькі няма, а я-ж непісьменны і нават хедэр не скончыў.

— Не спрачайся, Сурдзін, — адказваюць.—Ва ўсіх шаўцоў адна адукацыя. Гаспадары шпандырам вучылі, жалезную плітку ў вадзе мачыць прымушалі, за камаровым салам у аптэку пасылалі—вось і ўся наша прагімназія. А трэба-ж каму-небудзь профсаюзам кіраваць? Больш пісьменныя сядуць за старшыню альбо за сакратара, а ты, Шолам, будзеш падшукваць работу для беспрацоўных рабочых, як тутэйшых, так і прыезджых.

На гэту пасаду я згадзіўся. Сапраўды-ж, трэба каму-небудзь профсаюз узначальваць. Штодня пасля работы ў майстэрні, якая знаходзілася побач з вакзалам, іду, бывала, на Кладбішчанскую вуліцу, дзе ў хаце Гомельскай эмяшчаўся наш камітэт. Увечары туды прыходзілі і старшыня і сакратар, а ўдзень пустое памяшканне ахоўвала старая яўрэйка, удава шаўца, цётка Хая Быхаўская.

Улетку, якраз у пачатку ліпеня, калі цётка Быхаўская сядзела перад хатай на лаўцы і вязала панчоху, да яе падышоў незнаёмы салдат.

— Скажыце, калі ласка, ці не тут змяшчаецца профсаюз рабочых скуры?—спытаўся ён.

— Чаму не тут?—адказала цётка Быхаўская і, старанна агледзеўшы салдата праз свае акуляры, спыталася ў сваю чаргу: — А вам каго трэба?

— Я—шавец. Сёння прыехаў у Гомель і шукаю работу. Ці не ведаеце, часам, хто з членаў камітэта мне ў гэтым дапаможа?

Адклаўшы ў бок панчоху, цётка Быхаўская пачала распытваць салдата, адкуль ён прыехаў, ці жывы яго бацькі, ці вялікая ў яго сям'я і ці хутка скончыцца вайна. Атрымаўшы самыя падрабязныя адказы, яна паслала беспрацоўнага да мяне.

—Толькі не забудзьце, што яго завуць Шолам Сурдзін,—сказала старая.—Шаўца Лейзара Сурдзіна большы сын. Тут у нас, у Гомелі, два шаўцы Лейзары Сурдзіны. Адзін жыве ў Кагальным Рове, другі на Амерыцы. Дык гэты самы Шолам сын таго самага Лейзара, што жыве на Амерыцы. У яго яшчэ хата без даху.

Салдат падзякаваў цётку Быхаўскую і пайшоў.

Майстэрня Палескай чыгункі працавала на ваеннае ведамства і складалася з ваеннаабавязаных шаўцоў, таму на дзвярах яе вісела шыльда з вялікім надпісам:

«Уваход староннім асобам строга забаронен».

А начальнікам абутковай нашай майстэрні быў начальнік чыгуначнага дэпо Новікаў. Ён меў чын палкоўніка, хадзіў у ваеннай форме і насіў вялікую шашку. Але трэба сказаць, што ваеннаабавязаныя шаўцы, сярод якіх не было ні аднаго маладзейшага за сорак год, асабліва не баяліся свайго шавецкага палкоўніка. Варта яму толькі было выйсці з майстэрні, як мы адразу запявалі нашу старую песню:

Калодкі ў грубку пакідаем,
Не век сядзець за верстаком,
Пойдземце ўсе у чыста-поле,
Там будзем зіму зімаваць.
Зарадзім ружжы, пісталеты,
Злачынцаў будзем мы страляць.

Дык вось аднойчы працуем мы і паем гэтую песню, я вялікую латку на стары юхтовы бот кладу, як мне раптам перадаюць:

— Шолам, цябе там каля дзвярэй нейкі салдат пытае.

— Няхай крышку пачакае, — адказваю.—Толькі гэту латку прыстрачу.

Калі я выйшаў, дык убачыў маладога салдата ў патрапаным салдацкім шынелі без пагонаў, у салдацкай шапцы без какарды і ў казённых старых латаных ботах. Ён быў худы, з невялікімі чорнымі вусамі, з разумнымі вачамі.

— Што вам трэба?—спытаўся я, адкаўшы на дабрыдзень.

— Я прыехаў сёння ў Гомель,—гаворыць салдат.—Шукаю работу. Магу працаваць толькі ручную механічную работу. Я — ручны механічны шавец.

У нас, у ваеннаабавязанай майстэрні, такую работу работалі. Незнаёмы салдат мне спадабаўся з першага позірку. Таму я ўзяў у яго дакументы і пайшоў у дэпо шукаць начальніка, каб даведацца, ці патрабуецца яму ручны механічны шавец.

— Такі шавец нам патрабуецца,—сказаў начальнік, і я ўжо хацеў ісці за салдатам, але Новікаў, больш уважліва разгледзеўшы дакументы, нечакана заўважыў.—Не. Мы не маем права ўзяць гэтага чалавека на работу. Ён—франтавік-адпускнік, а мы бярэм толькі ваеннаабавязаных нефрантавікоў.

Я аддаў салдату яго дакументы і прапанаваў яму зайсці ўвечары ў профсаюз.

— Мы вам падшукаем работу ў іншым месцы,—кажу.—Без палкоўнікаў абыйдземся. Халера на іх галаву.

Калі я ўвечары прышоў у профсаюз, дык застаў салдата ўжо там. Ён прышываў да шынеля гузік і аб чымсьці ажыўлена гутарыў з цёткай Быхаўскай. Старая ўважліва слухала яго і раптам, схапіўшы шынель, пачала сама прышываць гузік. Потым, адкусіўшы зубамі нітку, працягнула шынель салдату:

— Насіце, добры чалавек, шынелю на здароўе, але хутчэй шынеля па ўсіх швах лопне, а гузік, прышыты цёткай Хаяй, ніколі не адарвецца.

Неўзабаве прышоў сакратар і мы, умовіўшыся паміж сабой, накіравалі беспрацоўнага ў шавецкую майстэрню Бенцмана.

— Гэты Бенцман вялікі махляр і жох, але вы яго асабліва не палохайцеся,—сказаў я салдату.—Профсаюз будзе вас абараняць.

— Я не з палахлівых,—адказаў, усміхаючыся, салдат і, падзякаваўшы, пайшоў.

Працуючы ў майстэрні Палескай чыгункі, я часам па вечарах хадзіў падзарабляць у майстэрню Бенцмана, але салдата ўжо там не заставаў. Ён адразу-ж пасля работы адходзіў з майстэрні. Праз які месяц, калі з арміі дэмабілізавалі ўсіх старэйшых за сорак год, я, саракачатырохгадовы ваеннаабавязаны шавец, кінуў майстэрню Палескай чыгункі і перайшоў працаваць у майстэрню Бенцмана. Тут я ўжо штодня пачаў сустракацца з салдатам. Работа механічнага шаўца стаячая і маё месца знаходзілася якраз насупраць яго месца.

Я ўжо ведаў, што прозвішча салдата Кагановіч. Рабочым майстэрні Бенцмана ён спадабаўся з першага дня. Рабочыя адразу заўважылі, што гэта разумны, свой чалавек. Асабліва ўсім нам падабалася, калі ён што-небудзь расказваў. Усё гэта ў яго атрымоўвалася добра і блізка сэрцу рабочага. Як толькі пачне салдат гаварыць, усе пакладуць у бок малаткі, кляшчы, нажы і глядзяць адным вокам яму проста ў рот, а другім на дзверы з опаскай паглядваюць, каб хто не зайшоў, бо за шчырыя гутаркі тады і ў турму саджалі. А калі хто з нас, бывала, запяе старую песню пра калодкі, дык і салдат яе падхопіць:

Зарадзім ружжы, пісталеты,
Злачынцаў будзем мы страляць.

І неяк аднойчы пасля песні, падбіраючы патрэбную калодку, салдат таварыш Кагановіч пытаецца ў мяне:

— За каго ты, Шолам, будзеш галасаваць пры выбарах у Учрэдзілку?

У той час я шмат чаго яшчэ не разумеў і таму нават здзівіўся:

— Як гэта — за каго? Вядома, за Керэнскага. Ён рэволюцыянер. Цара скінуў.

Тут наш салдат засмяяўся, ды так заразліва, што нам усім зрабілася смешна. А салдат смяецца, ды нейкую кніжку шукае. І тут мы ўбачылі, што кнігі ў яго знаходзяцца і за абшлагамі шынеля, і ў кішэнях, і за пазухай, і нават за халявамі старых латаных ботаў. Знайшоўшы гэту кніжку, ён пачаў нам чытаць ды растлумачваць, прыводзячы прыклады з нашага звычайнага рабочага жыцця—пра Леніна, пра большэвікоў, расказаў таксама пра Керэнскага і хто цара скінуў. І ён так пераканальна гаварыў, што мы ўсе вырашылі галасаваць толькі за большэвікоў. Нават сваіх жонак і суседзяў разагітавалі:

— Рыва, — сказаў я сваёй жонцы.— Ёсць у нас у майстэрні шавец, наш салдат таварыш Кагановіч. Куды ён пойдзе, туды і наша майстэрня. Адна ў нас, гомельскіх беднякоў, з ім дарога.

А наш дарагі таварыш салдат не толькі па кніжках вучыў нас, але і на практыцы паказваў, як трэба змагацца.

Перад самым прыходам таварыша Кагановіча ў майстэрню Бенцмана там адбыліся дзве дробныя забастоўкі. Грошы ўсё больш і больш дзешавелі, жыццё ўсё больш і больш даражэла, і аднойчы шаўцы папрасілі ў гаспадара надбаўкі па пяць капеек з пары абутку. Бенцман спачатку пачаў лаяцца, але потым просьбу задаволіў. І ў той-жа дзень рабочыя пачулі, як у яго абутковым магазіне, які аддзяляўся ад майстэрні не капітальнай сцяной, крычала пакупнікам галасістая Бенцманіха:

— Чаму вы абураецеся? Мы сапраўды набавілі на пару абутку па пяцьдзесят капеек. Але чаму? За гэта трэба лаяць не нас, а нашых рабочых. Гэта павышэнне цаны тлумачыцца выключна забастоўкай нашых рабочых. Нам прышлося цалкам здаволіць іх бессаромныя патрабаванні.

Яшчэ адзін раз рабочыя папрасілі пятачок з пары і Бенцман, прыбаўляючы ім пятачок, адразу-ж накідваў на абутак дзесяць пятачкоў, абвінавачваючы потым перад пакупнікамі рабочых у росце цэн. А калі рабочыя аднойчы не патрабавалі гэтага пятачка, дык Бенцман прышоў у майстэрню і спытаўся:

— Чаму вы не бастуеце? На базары-ж усё так дорага. І мяса, і малако, і яйкі. Проста не падступіцца. Ой, ой, ой! Як цяжка цяпер жыць! Як цяжка!

— Каб табе так цяжка жылося, як нам,—адказалі яму шаўцы.

Калі таварыш Кагановіч даведаўся аб гэтых забастоўках, дык, усміхаючыся, сказаў:

— Просьбу Бенцмана мы абавязкова здаволім, але новую забастоўку трэба правесці не так лёгкадумна, як папярэднія. Трэба спярша грунтоўна абмеркаваць патрабаванні, якія мы прад'явім гэтаму паразіту, і выпрацаваць план забастоўкі.

Бенцман схапіўся за галаву, калі мы цяпер патрабавалі ў яго надбаўкі па рублю ад пары абутку.

— Вы з мяне апошнюю вопратку здзіраеце!—крычаў стары махляр.—Ой, ой, ой! Як вам толькі не сорамна! Як не сорамна!

Ніякага сораму мы, зразумела, не адчувалі. Два дні стаяла майстэрня, але патрабаванні нашы гад Бенцман здаволіў. Цэны на рынку не дазволілі яму зрабіць чарговую надбаўку на абутак. Нашы патрабаванні ён здаволіў за кошт прыбытку, які раней цалкам клаў сабе ў кішэню.

Яшчэ больш вырас для нас пасля гэтага аўтарытэт салдата таварыша Кагановіча. Ён зрабіўся блізкім, родным чалавекам. Кожнае яго слова мы пачалі ўспрымаць, як сяброўскую параду, якую абавязкова трэба здзейсніць.

Неяк заўважыўшы, што я непісьменны, таварыш Кагановіч мне сказаў:

— Вучыцца трэба, Сурдзін. Абавязкова трэба вучыцца. Непісьменны чалавек—гэта нават не чалавек, а палавіна чалавека. Я цябе,—кажа,—навучу чытаць і пісаць.

Толькі нейкія прычыны не дазвалялі яму гэта зрабіць. Адразу пасля работы ён адходзіў з майстэрні. А якраз напярэдадні Кастрычніцкай рэволюцыі і зусім кудысьці знікнуў. Не прыходзіць у майстэрню дзень, другі, трэці. Мы ўсе ўсхваляваліся. Вырашылі пайсці шукаць яго, але ніхто з нас не ведае, дзе ён жыве, нават не ведаем, як яго па імю і па бацьку зваць, а Кагановіч—гэта-ж прозвішча вельмі пашыранае, усё адно як рускае прозвішча — Іваноў.

Бенцман, сукін сын, таксама зацікавіўся гэтым знікненнем.

— Што такое?—кажа. — Звычайна, калі рабочы адходзіць, дык загадзя разлік заяўляе. А тут без усякага разліку пайшоў і няма яго. Хаця ён забастоўшчык, але справу сваю ведаў добра. Таму мне цяпер чыстая шкода.

На чацвёрты дзень прыходзіць наш салдат таварыш Кагановіч вясёлы, у добрым шынелю, у добрай шапцы і толькі боты старыя, заднікі збітыя. Заходзіць у майстэрню і гаворыць:

— Віншую вас, таварышы, з Уладай Советаў.

Мы яму ўсе абрадаваліся, руку моцна паціскаем, але слоў яго не зразумелі. Глядзім яму проста ў вочы і нічога не разумеем.

— Большэвікі скінулі Керэнскага і яго прыхваснеў. Мы перамаглі!—растлумачвае ён і запрашае нас усіх прыйсці ўвечары ў князёўскі палац на сход.

Калі мы ўвечары прышлі, дык убачылі, што вялікая зала палаца, дзе раней гаспадары Гомеля графы Румянцавы ды князі Паскевічы цароў прымалі, уся перапоўнена. Тут і салдаты з гомельскага гарнізона — пехацінцы, кавалерысты, артылерысты. Тут і слёсары з чыгуначнага дэпо, і кавалі з заводаў Фруміна і Агроскіна, і спічачнікі з фабрыкі «Везувій». Большасць, як і мы, прышлі проста з работы—брудныя, у прамасленай альбо прапаленай вопратцы, але ўсе ўсміхаюцца і смяюцца:

— Хоціць Паскевічам панаваць. Цяпер тут мы гаспадары—Кагальны Роў, Амерыка, Каўказ, Манастырок, Свісток і іншыя гомельскія ўскраіны.

Вырашылі мы, шаўцы, вылучыць ад сябе ў прэзідыум таварыша Кагановіча.

— Наш профсаюз самы вялікі ў горадзе, — кажу я сваім. — Там у нас ёсць права правесці ў прэзідыум аднаго свайго рабочага. Мы пашлём ад сябе нашага салдата таварыша Кагановіча. Ніхто-ж, акрамя нас, пакуль-што не ведае, які ён добры чалавек.

У гэты час на трыбуну падняўся матрос з размеркавальнага пункта, і не паспеў ён яшчэ скончыць сваю прапанову вызначаць кандыдатаў у прэзідыум, як раптам уся зала закрычала:

— Кагановіча!! Таварыша Кагановіча!! Лазара Майсеевіча!!

Крычаць знаёмыя рабочыя з гомельскіх заводаў, крычаць незнаёмыя салдаты з гомельскага гарнізона, крычаць у адзін голас:

— Лазара Майсеевіча! Лазара Майсеевіча ў прэзідыум!!

Ад здзіўлення мы амаль што аслупянелі.—Адкуль яго ўсе ведаюць?—думаем.—Ён-жа, па-першае, не тутэйшы, а, па-другое, працаваў увесь час у нашай майстэрні. І ведаюць нават як па імю і па бацьку зваць, а мы толькі прозвішча адно ведаем.

— Не, Абрам,—кажу я суседу, крыху прышоўшы ў сябе ад здзіўлення.—Гэта не зусім звычайны механічны шавец.

— Не зусім звычайны, Шолам,—адказвае мне сусед, заціснуўшы ад здзіўлення сваю бараду ў кулак.

А наш таварыш Лазар Майсеевіч Кагановіч у гэты час ужо сядзеў у прэзідыуме і, заўважыўшы адтуль нас, усміхаецца нам, як самы просты, добры, блізкі, родны чалавек.

Тым часам на трыбуну ўзышоў бундавец, сын старадубскага рабіна. Ад імя бундаўцаў, меншавікоў і ўсякай іншай поскудзі, якой у Гомелі ў той час хапала, ён прапанаваў стварыць «Камітэт ратавання радзімы і рэволюцыі». У зале падняўся вялікі шум.

— Што вы нам прапануеце ратаваць?—закрычаў побач з намі фрумінскі каваль.—Палац князя Паскевіча?

— Тут у парку князь над магіламі

Працяг на 4-й стар.



Антон Паўлавіч Чэхаў

35 год з дня смерці

35 год прайшло з таго часу, калі памёр выдатны рускі пісьменнік Антон Паўлавіч Чэхаў. Сярод лепшых прадстаўнікоў тагочаснай інтэлігенцыі не стала вялікага чалавека і пісьменніка, які, па словах Горкага, ярка «асвятляў праклятую брудную праўду» таго жыцця, якім жыло рускае грамадства ў канцы XIX і пачатку XX стагоддзя.

Навелы і апавяданні Чэхава зрываюць маску з таго класа, які парадзіў «унтэра Прышыбеева» і «Палату № 6». Нянавісцю да застоенага балота, да насілля, сытага самаздавальнення і верай у шчаслівую будучыню прасякнуты ўсе яго кароткія, але высокамастацкія апавяданні. «Настаў час, надыходзіць на ўсіх нас грамадзішча, рыхтуецца вялікая, моцная бура»... — пісаў Чэхаў у «Трох сёстрах». Гэта бура, па думцы выдатнага майстра слова, павінна была змесці з зямлі насілле, ленасць і гнілую пошласць.

Як і ўсякае сапраўднае мастацтва, проза Чэхава з вялікай сілай гучыць у нашы дні. Працоўны народ, новае пакаленне яго, выпеставанае вялікім Кастрычнікам, зразумела і цэніць у Чэхаву тое, чаго ніяк не жадала зразумець і ацаніць сучасная яму інтэлігенцыя. У той час, калі Чэхаў быў для яе чалавекам, прасякнутым беспрасветным песімізмам, — для нас ён перш за ўсё аптыміст, майстар цепраўзайдзёнага да гэтага часу кароткага апавядання, пісьменнік, які аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне свядомасці перадавой інтэлігенцыі.

Амаль цэлае пакаленне дарэволюцыйных пісьменнікаў вучылася ў Чэхава рэльефнасці вобразаў, стройнасці кампазіцыі, трапнай метафары, яснасці выражэння думкі. Чэхаў праклаў новыя шляхі ў літаратуры ў стварэнні кароткіх апавяданняў, у якіх «не вылучалася ніводнай складкі».

У дасканалым веданні рэчаіснасці, у разуменні пісьменніцкай адказнасці, у вялікай здольнасці наглядаць і адбіраць для паказу найбольш тыповае, у праўдзівасці прычына неўміручасці Антона Паўлавіча Чэхава.

Асноўнае гістарычнае значэнне Чэхава заключаецца ў паказе ім пошласці, ліцамер'я, тупасці казённай Расіі, аб якой ён гаварыў: «такая недарэчная, нязграбная краіна гэта наша Расія».

«Антон Чэхаў ужо ў першых апавяданнях сваіх умеў адкрыць у цьмяным моры пошласці яе трагічна-змрочныя жарты, варта толькі ўважліва прачытаць яго «гумарыстычныя» апавяданні, каб упэўніцца, як многа за смешнымі словамі і палажэннямі—жорсткага і брыдотнага з смуткам наглядаў і сарамліва хаваў аўтар», — так пісаў Горкі аб Чэхаву. Горкі гаварыў аб Чэхаву, што «ён робіць вялікую справу маленькімі апавяданнямі, абуджаючы ў людзей агіду да гэтага соннага, напоўмёртвага жыцця — чорт-бы яго пабраў». Апавяданні Чэхава «Крыжоўнік», «Дама з сабачкай», «У яры» і інш. усяляюць, як пісаў Горкі, «ноту бадзёрасці і любві да жыцця».

Усе да незвычайнасці кароткія апавяданні Чэхава маюць вялікае палітыка-выхаваўчае значэнне. Пры дапамозе іх моладзь лепш пазнае праклятае мінулае, на навелах Чэхава выхоўваюцца сотні маладых пісьменнікаў нашай вялікай радзімы.

«Ва ўсіх сваіх кнігах, — піша французскі вучоны Анры Дзюкло, — Чэхаў застаецца благародным энтузіястам, які марыць аб тым, каб усіх пазбавіць ад мучэнняў, усім вярнуць здароўе і маральныя якасці».

ГАСТРОЛІ УКРАІНСКАГА ДРАМТЭАТРА Ў МАГІЛЕВЕ

У Магілеве закончыў гастролі Украінскі дзяржаўны драмтэатр імя Т. Г. Шаўчэнка.

За час гастроляў тэатр паказаў пастаноўкі: «Павел Грэкаў» Войцехава і Ленча, «Качубей» Первенцава і Охлопкава «Наталка-Палтаўка» Катляроўскага, «Забаўны выпадак» К. Гальдоні, «Бесталанна» Табілевіча і «Назар Стадоля» Тараса Шаўчэнка.

Магілеўскі глядач надзвычай цёпла сустрэў тэатр братняй рэспублікі. За поўмесяца яго пастаноўкі праглядзела каля 14.000 гледачоў.

З асаблівым поспехам прайшоў спектакль «Павел Грэкаў».

Зараз тэатр на гастролях у Віцебску, дзе мяркуе паказаць прэм'еру «Мяшчане» М. Горкага.

Ал. СТАНКЕВІЧ.

Курсы — канферэнцыя пачынаючых пісьменнікаў

УРАЖАННІ ПЕРШЫХ ДЗЕН

Інтэнсіўна праходзіць вучоба на курсах-канферэнцыі маладых аўтараў. 27 пачынаючых пісьменнікаў, паэтаў, крытыкаў, удасканальваюцца і пашыраюць свой кругагляд, чэрпаючы веды з творчых сустрэч з пісьменнікамі і паэтамі, з лекцый вопытных лектараў.

З вялікай цікавасцю былі праслуханы намі лекцыі навуковага працаўніка тав. Дворкінай аб творчасці Шэкспіра, Гейне і Флабера, лекцыі крытыка Бярозкіна аб Маякоўскім, лекцыі аб творчасці Максіма Горкага, Нікалая Остроўскага, Міхася Лынькова.

Асаблівае ўражанне зрабіла на нас сустрэча з народным пісьменнікам Якубам Коласам і гутарка з паэтам-ордэнаносцам Пятром Глебкам аб яго рабоце над драмай «Над Бярозай-ракой».

Праграма курсаў абдумана ўсебакова і азнаямленню з сумежнымі відамі мастацтваў у ёй аддаецца галоўнае месца. Сустрэча з засл. дзеячом мастацтваў скульптарам Азгурам, азнаямленне з асобнымі творамі беларускіх скульптараў значна ўзбагаціла нашы веды ў галіне гэтага мастацтва. Дзень, праведзены з тав. Азгурам, быў адным з цікавейшых дзён нашай вучобы.

За першыя пяць дзён прабывання на курсах-канферэнцыі намі прагледжаны музычная камедыя «Аршын мал алан» у пастаноўцы тэатра музкамедыі БССР і дзве шэкспіраўскія трагедыі — «Гамлет» і «Рамео і Джульета»—у пастаноўцы Ленінградскага тэатра імя Ленсовета.

Абмеркаванне пастановак, арганізаванае крытыкам тав. Модэлем, дапамагло лепшаму ўспрыняццю гэтых найвялікшых твораў сцэнічнага мастацтва.

Наперадзе яшчэ шмат упартай працы і цікавых сустрэч. Шкада толькі, што паасобныя курсанты (Місюн, Вярхоўскі) парушаюць вучэбную дысцыпліну.

Барыс ГЛІКІН.

Страница русской секции ССП БССР

Авива ЛЕВИНА

Размолвка

Закружились в пляске жаркой
солнечные пряди,
я пришла сегодня в ярком
праздничном наряде.
Я пришла такой веселой,
самою счастливой,
точно девочка из школы
мчалась шаловливо...
Я почти бегом бежала,
трудно отдышаться...
Словно шлюпка на причале
сердце стало рваться.
Почему ж встречаешь хмуро
ты приход подруги,
чертишь на песке фигуры,
эллипсы и круги?
Молчаливо руку подал,
процедил два слова, —
мол, хорошая погода,
да спросил: здорова ль?
Ах ты, друг мой сероглазый,
что с тобою стало,
может быть, тебя я сразу
чем-то напугала;
лепестков пахучим снегом,
шопотом: «Желанный».
Только ты ведь не Онегин,
я же не Татьяна.
Все не хочешь улыбаться,
говоришь сурово:
«Ты характера, признаться,
слишком озорного.
С кем стояла на крылечке
под вечер вчера ты?
Почему торчат там вечно
всякие ребята?»
Ах ты, сероглазый, милый,
глупый мой Отелло,
ну, к кому б я так спешила,
ну, к кому б летела;
что с того, что постояла
с кем то у крылечка,
ну и что ж, коль я сказала
пареньку словечко?
Вот возьму да потяну я
чуб твой белокурый,
никого так не люблю я,
как тебя, мой хмурый.

Н. ГОРУЛЕВ

Весенний вечер

Тихо погас багровый закат,
Месяц повис, как подсолнух.
Плещется
мерно река,
Сталью
сверкают волны.
А рядом—
на горке—
под крыльями лип
Гранитная глыба
склонилась в печали.
Как тысячи глыб,
она молча стоит
В память героев,
что здесь умирали...
Девушка возле камня поет.
В руках у нее—
цветы весенние.
Песня с Днепром слилась и плывёт,
Плывёт и у темного берега пенится...
Девушки песня,
Ты в душу входи,
Ты настежь открой ее дверцу:
«...Мы никому
Отнять не дадим
То, что дорого сердцу».
Я песню ее
подхватил на-лету,
Взволнованно поднял над городом—
За славных борцов
и за их мечту,
Живущую в счастье народном.

Иван ТИМОШКОВ

*

Гром ударил где-то далеко,
Дождь прошел. Весенний вечер близок.
Кто-то ищет в песне Сулико,
Но найти подругу не легко.
Ветер тронул листья кипариса,
С ним я здесь, а сердце далеко.

В берег бьет вечерняя волна,
Мне тревогу легкую приносит.
Я хожу, смотрю по сторонам.
Час пришел... Багровая луна
Выплывает в сумрачную просинь.
В берег бьет вечерняя волна.

Я хожу по берегу один,
И не знаю, где тебя я встречу.
Если здесь — в глаза мне погляди,
Если там — хоть в песне прилети:
Не могу с душою человечьей
Я ходить по берегу один.



«Пуск гідрастанцыі» — эскіз карціны маст. Лі да выстаўкі «Ленін і Сталін» — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».
Фота І. Каплінскага.



Курсы-канферэнцыя маладых пісьменнікаў пры ССП БССР. На здымку (злева направа): першы рад — А. Цармон, Л. Клюйко, П. Хадарэнка; другі рад—Б. Глікін, В. Місюн, Л. Закс, Д. Кавалёў.
Фота І. Каплінскага.

Э. ВОЛОСЕВИЧ

У ПАМЯТНИКА

Я у памятника.
Год встает двадцатый.
... Ночь...
Лучом прожектор ясным
Лижет небо;
между туч косматых
Рог луны висит багрово-красный.
В ночь такую
Храбрых коммунистов
Мучили бандиты...
Расстреляли...
На траве холодной и росистой
За республику герои умирали...
Я у памятника.
Вечер теплый, мглистый.
Хоботы поднявши литые,
Охраняют спящих коммунистов
Две мортиры,
у врага отбитые.
А напротив —
парк горит огнями.
Звездам в небе —
тем завидно даже.
Как светляк,
горящими огнями
Месяц
в кромку неба
всажен.
А из рупора
мотив несется плавный,
У танцующих —
в улыбке лица.
На душе легко и славно,
Хочется без края веселиться.
... Ваша жизнь
в фундамент счастья этого
Первым камнем
нерушимо вложена.
Ваша кровь —
в крови поэтовой
Запевает громко
и восторженно.

А. КУПЕРШТОК

ИЗ ОШЕРА ШВАРЦМАНА

Ошэр Шварцман (1889—1919) — буйнейшы яўрэйскі паэт, родапачынальнік яўрэйскай совецкай паэзіі. Жыццё Шварцмана было вельмі кароткім. Пасля яго засталася невялікая кніга лірычных вершаў. Ошэр Шварцман загінуў у росквіце сваіх творчых сіл у радах Чырвонай Арміі ад польскай кулі.

I.

КОРЧМА

На старой дороге, в полях за деревней
Корчма доживает свой век не у дел
И думает думу, как дедушка древний,
Что в юности давней мирами вертел.

— Ну, мчитесь же, ветры, срывайте солому,
Поля осушайте до поздней поры.
Веселая юность ко мне не вернется —
Не в гору иду я, спускаюсь с горы.

Стоит неподвижная дверь на запоре,
Сарай повалился, бурьян у крыльца.
Не слышно в кружке, как бывало, историй
Чудесных и страшных всю ночь без конца.

И дикая песня, и голос печальный
С горячим вином на губах не кипит.
Сурового пьяницу черная тайна
И в дрожь не бросает, и в мозг не сверлит.

Стоит этот дом и пустынно, и голо.
Проезжий застынет порой у ворот,
Но, вспомнив, что путь еще скучен и долог,
В тулуп запахнется и коней хлестнет.
Лишь ветры, что мчатся в просторах широких,

Напомнив корчме о грехах, о былом,
Смеются лукаво... Она ж одинока,
Как жалкий старик, что пристыжен юнцом...

1908 — 1909.

II.

Луч солнца морскую волну целовал,
Пригнувшись к ней нежно и смело.
Метнулась волна, как неистовый вал,
И дольше дышать не хотела.
1909 — 19.

III.

НЕ ОЛЕНЬ...

Не олень, в испуге тихом
Тонко уши навострив,
Уловил далекий шорох
И отпрянул, уловив, —

Это девушка дрожала:
Не могла понять она,
Что такое к ней приходит,
Грудь теснит, лишает сна...
1910. Киев.

Д. ПИНСКИЙ

Профессия

Я часто встречался с девушкой.
Однажды она спросила:
Кто же ты по профессии,
Милый, хороший мой?
Я от стыда зарделся
И нехватило силы
Признаться ей откровенно,
Что я лишь всего — портной.
Конечно, и это профессия,
И я люблю ее даже,
Но, знаете... нашим девушкам
Нравится больше герой.
Ну, кто же из вас, товарищи,
Любимой своей расскажет,
Что он не зимовщик, не летчик,
А самый простой портной!
Ветер дул так приятно,
Словно бы по заказу.
И самолет краснокрылый
Над парком крылья простер.
Сказал я себе: «Так надо!»
А ей, не сморгнувши глазом,
Что брат мой — известный летчик,
А сам я — электромонтер.
Деревья своей листвою
Шумели торжественно, тихо.
Но вдруг проходящие девушки
Кивнули нам головой.
Я спросил ее: «Кто это?»
Она мне сказала: «Ткачихи;
Они на фабрике ткацкой
Работают вместе со мной».
Так, значит, она — ткачиха!
Зачем же, зачем же врал я?!..
И я обо всем откровенно,
От всей души, рассказал.
А милая, все прослушав,
С улыбкою мне сказала:
— Тебя я прощаю, любимый, —
И заглянула в глаза.
У выхода мы прощались,
А птицы нам пели песни,
Она пошла на собрание,
А я ей махнул рукой.
Я радостный шел по улице.
Так, значит, моя профессия
Совсем не такая плохая,
И даже не хуже другой.

Аркадий ГЕЙНЕ

В чужой одежде

В селении «Н» задержан неизвестный, скрывающийся под видом нищего. Внутри его «костыля» обнаружены зашифрованные документы.
Ведется следствие.
(Из газет).

У старой церкви нищий вдруг,
Как призрак, вырос предо мною,
Немой протянутостью рук
И неподвижностью слепою
Напомнил живо деда мне
Стоящий у гнилой ограды.
И пролетели, как во сне,
Виденья безвозвратной правды:
... Мой дед был прогнан со двора
Свирепым барином и строгим.
В январский холод до утра
Он мерз у столбовой дороги.
Глаза слепые ничего
Не видели. Он шел, блуждая.
На утро подобрал его
Добряк какой-то, проезжая,
Пригрел слепого, покормил
И день, и два. На третий молвил:
— Ты б в людях, старец, походил...
Суму да палку приготовил.
И, дармоедом не слывя,
Дед по миру пошел с сумою,
И острый голод у ручья
Он часто запивал водою...
Однажды у окна господ
Стоял он, седину пригладив,
И, руку протянув вперед,
Просил с молитвой христа-ради.
И кем-то брошенный алтын
В ладонь морщинисто-сухую
Схватил со смехом барский сын
И закатил в траву густую.
С улыбкой горькой на устах
Ушел слепой, махнув рукою.
И в ярких солнечных лучах
Сверкнули слезы над щекою...
Прошли лета, умчав с собой
Несчастья старины проклятой...
Но как же — нищий в час такой
В стране невиданно богатой? —
Я диву дался.
Но потом
Вскипело сердце ярой злобой,
Когда пошел он под ружьем,
Здоровый, зрячий и безгорбый.
Личина снята. Враг раскрыт
И возмущенью нет предела.
Я не позволю, чтоб бандит
Скрывался под одеждой деда!
Мой дед был честный человек!
Сейчас он был бы сыт с избытком,
И тех, кто гнал его в тот век,
Узнал бы под своею свиткой...

Д. КОВАЛЕВ

Вечер

Сойдя на самый край земли,
Багрянцем солнце истекло.
На лес задумчиво вдали
Облокотился небосклон.
За ветряком во ржи растаял
Вечерний крик перепелов.
Прохлада — парная, густая —
От луга тянется в село.
И переполнена душа
Дыханьем луга ароматным.
Идут коровы не спеша
С колхозных пастбищ
К тихим хатам.
Коней ребята на ночлег
Ведут, смеясь, гурьбой веселой.
Дымком запахло на селе.
Роятся звезды, словно пчелы.
В голубоватом полусвете,
Слегка скользя по тростнику,
Луна серебряные сети
Безмолвно кинула в реку.
И будто в сумраке ночном
Раздался глубже свод небес.
И засыпает чутким сном
В постели лунной дальний лес.
Молчат тенистые аллеи.
Луна играет в каплях рос.
И у дорог, блестя, белеют
Стволы столпившихся берез.

Б. Макарцев

ФЛОТИЛИЯ К БОЮ ГОТОВА

Отрывок с пьесы „Даёшь Волгу!"

П'еса тав. Макарцава адлюстроўвае барацьбу совецкага народа супроць белагвардзейшчыны і чэхаў — за Волгу.

Маладая соцыялістычная рэспубліка траціць Волгу, а з ёю нафту, харч, сыравіну. Совецкі ўрад вырашае прыняць экстраныя меры. «Волга павінна быць свабоднай!» — і народ падхоплівае гэты лозунг, ідзе на падтрыманне Чырвонай Арміі. У Ніжнім-Ноўгарадзе пад кіраўніцтвам сакратара губкома РКП(б) тав. Кагановіча Л. М. у некалькі дзён ствараецца Волжская флатылія. У склад каманд «ваенных караблёў» з чатырох мораў прыбываюць рэволюцыйныя матросы, ідуць добраахвотнікамі маладыя і старыя валгары, праз Марыінскую сістэму прыходзяць на дапамогу тры мінаносцы, і бой пад горадам вырашае лёс Волгі. Чырвоная Армія перамагае.

Друкуемы ўрывак паказвае старонку гісторыі падрыхтоўкі Волжскай флатыліі.

***

Один из Нижегородских затонов. Вдали виден город. На берегу и на пароходах кипит работа. Флотилия готовится к выходу на фронт. На переднем плане стоит пароход «Ваня», на нем работают матросы: обивают борты броней, ставят пулеметы, моют палубу. На носу, на веревочной лестнице, висит Свистун и старательно подновляет надпись «Ваня». Невдалеке от него моет палубу Рыжиков.

Дальше видны другие пароходы. Слышатся металлические звуки, песни, веселый шум, разговоры. Где-то гармошка наигрывает волжские частушки. Свистунов напевает вполголоса под гармошку.

На берегу под командой Ефимыча обучаются добровольцы, в числе их и дед Палашкин. Они проходят взад и вперед по сцене несколько раз и скрываются.

Свистунов. Чудесно. Изумительно. Ты, Вася Свистунчик, право слово, художник-натуралист.

Рыжиков (шутливо). Вася-богомаз, тебе кисточку не надо? (Спускает к нему швабру).

Свистунов. Не финти, Гришка, а то, будь я трижды проклят, ежели тебе морду краской не заляпаю.

Рыжиков. Вася, нарисуй с меня Иисуса Христа.

Свистунов (смеется и чуть не сваливается с лестницы). Если Гришка, твою паршивую рожу христосику приделать, пропадут поповские доходы, такую икону заплюют благочестивые богомольцы. (Всматривается в Гришку). Постой, постой, Гришка, а ты действительно похож на чорта из пекла. (Матросы все смеются). Тебе твоя Манюшечка вероятно часто напевает (напевает): «Сидит Гришка на крыльце, с выраженьем на лице. Я не долго думала, подошла да плюнула». (Смех. Входит Маркин).

Маркин. Здравствуйте, ребята. (Ему хором отвечают «здравствуйте» Свистунов хочет повернуться к нему лицом и поприветствовать, но это ему не удается). Да ладно уж, товарищ Свистунов. Не старайтесь, работайте.

Свистунов. Есть, товарищ командующий. Домалюю одну букву «Я» и пароходик к бою готов.

Маркин. А где командир корабля?

Свистунов (кричит). Командир корабля, к командующему! (Команда передается другими матросами. С трапа сбегает первый матрос).

Первый матрос. Я командир корабля.

Маркин. Ну, как у вас дела?

Первый матрос. Разрешите доложить, товарищ командующий. Осталось закатить на палубу пушки, и корабль готов к бою.

Маркин. Прекрасно. (На берег сходят Свистунов и Рыжиков, закуривают).

Свистунов (любуется на свою работу). А ну, скажи, Гришка, по совести, — художник я, чи не художник? Буковки блестят, что у попа кадило.

Рыжиков. А кто знает, что это ты малевал?

Свистунов. Как кто? А, вот, давай спросим. (Оглядывается по сторонам. За сценой раздается песня «Вдоль по речке, вдоль да по Казанке, серый селезень плывет»). А ты глянь, Гришка, старичок шагает, что генерал от инфантерии. (Смеются. Через сцену проходят несколько добровольцев, на левом фланге дед Палашкин. Ефимыч, проходя мимо Маркина, подает команду «смирно». Свистунов дергает за полу старика, тот останавливается и берет под свой счет винтовку к ноге). А скажи, дедусю, что вон там намалевано?

Дед Палашкин (смотрит через кулаки, как в бинокль, и читает по складам). Вы... а... ни-. я... Ваня, вот што намулевано.

Свистунов. А кто это написал, дедусю?

Дед Палашкин (смотрит на него). Знамо, ты (смеется). На лбу-то ведь написано. (Берет на плечо винтовку и на ходу поворачивает голову к Маркину. Маркин смеется).

Свистунов (вытираает краску с лица). Ты гляди, какая же это галюка мне на лбу написала, что я художник? (Смеются. За сценой слышен автомобильный гудок. Входит Каганович).

Каганович (подходит к Маркину). Ну, как ваша флотилия?

Маркин (здоровается). Работа кипит, Лазарь Моисеевич. Только вот брони нехватает. Всю жесть, все котельное железо в Нижнем забрали.

Каганович. А вон тюки лежат на набережной с хлопком. Намочите их как следует, сделайте себе баррикады. Никакая пуля не пробьет.

Маркин (радостно). А это совершенно верно. Помню, еще в тысяча девятьсот пятом году это средство применяли.

Каганович. Испытанное, надежное средство. (Смотрит на пароход). А почему этот пароход «Ваня» называется?

Маркин. У нас, Лазарь Моисеевич, есть три богатыря. Ваня Кочет — это командир одного из боевых отрядов; бывший волжский бурлак, пример храбрости и отваги. Ольга — дочь профессора Прозорова, того самого старика, который вытянул меня из могилы, благодаря своим прекрасным медицинским способностям. Эта Ольга выдала нам все замыслы предателя Горского, своего зятя. Жаль, что это было слишком поздно. И совсем недавно, она, раненая, перебежала к нам, теперь героически, с винтовкой в руках, дерется в наших рядах.

Каганович. Дочь, достойная своего отца.

Маркин. Да, хорошая дочь. И третий— это Федька, наш приемыш. Мальчонка без роду, без племени. Пока он у нас Федька, а подрастет — будет Федор Федорович Красноармейский. Так он сам себя величает. Взяли мы его трубачом, в полк, а он оказался замечательным пулеметчиком. Много раз уже бывал в боях. Так, вот, в честь этих наших трех любимцев, бойцы просят назвать их именем три парохода Волжской флотилии.

Каганович. Совершенно правильно, товарищи. Я только приветствую это дело. Нужно видеть наших героев и выдвигать их, как пример другим. А у нас много еще есть людей преданных, истинных героев, но еще не замеченных. Выдвигайте, товарищ Маркин, молодых, энергичных людей на большие посты, не бойтесь, они оправдают себя. Это наши кадры, наши командиры, которыми будем заменять ненадежных военспецов. Непременно назовите их именем пароходы, пусть это будет наградой за их боевые заслуги. А меня при случае познакомьте с этой героической тройкой.

Маркин. Обязательно представлю вам, их, Лазарь Моисеевич. Замечательные ребята. (Матросы закатывают на палубу орудия).

Каганович. Ну, а как орудия: еще не пробовали?

Маркин. Нет еще, Лазарь Моисеевич; сейчас сделаем пробный выстрел

Каганович. Только нужно убрать, товарищ Маркин, с палубы всех людей. Суденышки-то не особенно надежные. Развалятся.

Маркин (командиру корабля). Как зарятят орудие, зарядить. Людей всех на берег, провести шнур от замка и выстрел с берега.

Первый матрос. Есть выстрел с берега. (Уходит).

Каганович. Ну, что ж, несколько пароходиков надо поторопить спустить к Свияжскому мосту. Мост надо отстоять. Нашим товарищам нужна помощь.

Маркин. Сегодня в ночь отплывем. Лазарь Моисеевич.

Первый матрос (докладывает). Все готово, товарищ командующий; разрешите начинать?

Маркин. Давайте, начинайте.

Первый матрос. Команда, на берег! Комендоры — выстрел с берега. (Повторяют команды, готовятся к выстрелу. Все с интересом ждут результата). Выстрел.(Раздается выстрел, пароход покачивается. Возгласы «ура»).

Каганович. Ну, как ребята, наши дредноуты? (Возгласы «на два господа», «хороши», «белякам не сдобровать»).

Свистунов. Вот так Ванюшка, дает жизни.

Дед Палашкин. Это што, вот в русско-японскую-то войну бухали, так бухали. Я ведь тоже матросом был.

Свистунов. Вот вы, папаша, и пробухали япошкам Сахалин, да Порт-Артур. (Все смеются).

Дед Палашкин (обидчиво). Это не мы пробухали, это яняралы, продажные души, адмерал Ражественскай, был такой.

Каганович (смеясь). Ну, а сейчас, старик, не пробухаете Нижний-то Новгород, как этот адмирал Рожественский?

Дед Палашкин. Не, Лазарь Моисеич. Таперича не выгорит белякам. С таким адмиралом, как ты, ничего не пробухаем. (Смеются).

Маркин (к командиру корабля). «Ваня» будет флагманским кораблем. Мой штаб расположится на нем. Вам поручаю к десяти часам собрать всех командиров кораблей на «Ваню». Назначить на кораблях боевой расчет, дежурных на вахту, рулевых, сигнальщиков. Кстати, кто у нас может быть хорошим сигнальщиком?

Первый матрос. Товарищ Свистунов может быть. Он хорошо знает сигналы.

Маркин. Если он так же сигналит, как пляшет, тогда хорошо. Как, товарищ Свистунов, сигналить-то умеешь?

Свистунов (вытягиваясь). Так точно, товарищ командующий, умею. (Он отдает сам себе команды и дублирует их сигналами на руках). «Боевая тревога», «Кормовые башни к бою»; «Лево на борт»; «Поднять флаг на верхнюю рею фок-мачты».

Дед Палашкин (наблюдает с большим интересом). А вот поднять андреевский флаг—не знаешь.

Свистунов. А на черта он нам, андреевский-то флаг? Что мы, белогвардейцы али махровые монархисты? (Все смеются).

Маркин. Ну, ладно, молодец, не забыл еще. Будешь на «Ване» сигнальщиком.

Свистунов. Есть сигнальщиком. (К старику). Ну, что, борода, а? Меня чорта лысого подведешь.

Маркин. А теперь, ребята, давайте-ка за тюками с хлопком. Их надо в воде мочить и на борт, баррикады будем устраивать. Вот и десантников прихватим, они нам помогут.

Первый матрос. Пошли, братва. (Матросы уходят).

Каганович. Ну, давайте и я вам помогу. (Уходят с Маркиным).

Свистунов. А ну-ка, пошли, старичечек, на аврал. Я одну тютечку нагружу себе на горбушку, а ты мне подможешь.

Дед Палашкин. Пойдем, пойдем, сынок. (Уходят. Каганович и Маркин первые несут тюки, за ними все матросы носят тюки на пароход. Свистунов несет большой тюк, сзади помогает Палашкин).

Свистунов. Дедусю, налево валится, держись левого борта, вот, вот. К земле дьявол давит, ну, ничего, вира помалу. Давай потихоньку курс норд-ост пятьдесят градусов, вон прямо на трап. Держись в кильватер, папаша.(Кряхтит под тяжестью). Да не туда, старик, возьми румба на два правее, вот, поехали потихоньку. (На середине трапа останавливается). Стоп, машина, катастрофа. (Тюк сваливается. Сзади скопляется очередь — их торопят. «Ну, давай там, какого чорта»).

Дед Палашкин. Эх, где мои двадцать лет. Ну-кось, дай, сынок, я как бывало на барже. (Взваливает тюк и заносит его на пароход. Все смеются над Свистуновым).

Свистунов (смущенно). Вот тебе и дедулечка. Это вам не какой нибудь матрос с разбитого корабля. (Каганович и Маркин сходят на берег. На «Ване» отбивают склянки, на всех пароходах повторяют).

Маркин. Склянки бьют полдень...

Каганович (смеется).Это действительно как военная флотилия. Ну, давайте товарищам отдых.

Маркин. Команда—на обед. (Бросают работу, шумно расходятся. За сценой слышится пение «Раскинулось море широко, и волны бушуют в дали»... Песня постепенно стихает).

Каганович (слушает). Хорошо ребята поют.

Маркин. Хорошо, Лазарь Моисеевич, и драться будут. (Уходят).

Занавес.

АБ МАСТАЦКІХ ТВОРАХ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

★

Г. КАНАВАЛАЎ

★

За апошні час у газетах, часопісах і асобнымі зборнікамі было надрукавана каля дзесятка апавяданняў, напісаных маладымі беларускімі пісьменнікамі для дзяцей. Галоўнае месца ў гэтых апавяданнях займае тэма аб граніцы. Трэба сказаць, што тэма гэта надзвычай цікавая і багатая. Аднак, як гэта ні шкада, у літаратуры, асабліва ў дзіцячай, яна распрацавана павярхоўна і вельмі слаба.

А граніца цікавіць савецкіх дзяцей. Малыя патрыёты захапляюцца адвагай байцоў-пагранічнікаў, жадаюць самі стаць такімі-ж героямі, як яны. Тыя з іх, што жывуць ля граніцы, дапамагаюць дарослым у ахове савецкай зямлі ад шпіёнаў і дыверсантаў, авалодваюць ваеннай справай і адначасова выдатна вучацца ў школах, вучацца бальшавіцкай пільнасці, мужнасці, кемлівасці. Кожны незнаёмы чалавек выклікае ў нашых дзяцей насцярожанасць. І, зразумела, што ворагі абыходзяцца з дзецьмі вельмі асцярожна.

Цяпер паглядзім, як пісьменнікі спраўляюцца з узятай імі тэмай. Возьмем толькі некаторыя апавяданні. Вось, напрыклад, «Выпадак на чыгунцы» А. Якімовіча, «Дружба» П. Левановіча, «Дзед Юльян і Аркаша» А. Стаховіча, «Піонерка Валя» П. Рунца і п'еса «Шалёная рысь» М. Паслядовіча. Сюжэты і нават вобразы ва ўсіх гэтых творах падобны адзін да другога. Таму мы абмяжуемся кароткім пераказам апавядання «Дружба» П. Левановіча.

Вясковы хлопчык Тарасік надта дружыў са сваім сабакам Дружком. Аднойчы яны накіраваліся да ракі і ў лесе сустрэлі незнаёмага. Незнаёмы аказаўся шпіёнам. Ён накінуўся на Тарасіка: сціснуў яму здаравеннай рукой горла, скруціў вяроўкай рукі і ногі. На дапамогу Тарасіку кінуўся Дружок. Хлопчык, карыстаючыся гэтым, развязаў свае рукі, схапіў наган, і шпіён быў затрыман.

У астатніх творах дзеці сустракаюць шпіёнаў таксама **абавязкова** толькі ў лесе. Шпіёны абавязкова крычаць «стой!», дастаюць з кішэні рэвальвер, наводзяць яго на затрымальнікаў і пагражаюць забойствам. Вядомая рэч, што шпіёны не такія дурні, як гэта думаюць многія аўтары. Дзейнічаюць яны хітра і каварна. Не заўсёды вораг будзе абавязкова шырокаплечым, зверападобным, не заўсёды ён будзе пераапранацца пад жабрака, хадзіць з прыклеенай барадой і бярозавым кіем, жыць у лесе альбо ў іншым цёмным кутку. Вось гэта і трэба паказаць, растлумачыць маладому чытачу, каб яшчэ больш завайстрыць яго рэвалюцыйную пільнасць.

Некаторыя-ж аўтары гэтага ніяк не хочуць зразумець, не жадаюць адмовіцца ад штампу, схематычнасці, не займаюцца глыбокім вывучэннем жыцця і сур'ёзныя рэчы апісваюць несур'ёзна. Шмат хто ў пошуках тэмы збіўся з дарогі, заблудзіўся, як кажуць, у трох соснах, топчыцца на месцы, паўтарае тое, што было сто разоў сказана да яго, і ніяк не можа выйсці на прастор, на шырокую творчую дарогу, не падае ніякіх адзнак росту.

У апавяданні «Піонерка Валя» П. Рунца сустрэча піонеркі са шпіёнам апісана так.

Выконваючы даручэнне мамы, дзяўчынка заходзіць у пуню. Там яна заўважыла на сене незнаёмага чалавека. І гэты незнаёмы адразу

«грозна сказаў: «Пачакай» і здаравеннымі ручышчамі схапіў Валю за руку.

— Ты мяне ведаеш? — пытае ён прыцішана.

— Не, не ведаю, — палахліва адказала Валя.

— Так! Не трэба і ведаць. Я кажу сур'ёзна. Што? Ідзі і нідзе нікому не расказвай, што бачыла мяне, нават бацькам не кажы. А не — дык жыць табе больш не прыдзецца! — Ён выцягнуў з кішэні бліскучы рэвальвер і грозна запытаў:

— Ты бачыла такую штучку? Не бачыла? Дык вось, ведай: націсну гэты кручок і... цябе не будзе ў жывых. Разумееш? А цяпер ідзі і больш сюды не прыходзь!»

Амаль гэта-ж, толькі ў больш сціслай форме, сустракаем і ў п'есе М. Паслядовіча «Шалёная рысь». Піонер Віця, ходзячы па лесе, трапіў на незнаёмага. Завязалася кароткая гутарка. Незнаёмы спытаўся пра нейкага чалавека з завязаным вокам. Віця адказаў, што сустракаў такога чалавека.

«**Незнаёмы** (дапытліва пазірае на Віцю, сурова). — Не хлусіш?

Віця. Чэснае піо... (схамянуўшыся). Далібог!

Незнаёмы (усхватваецца, пагрозна набліжаецца да Віці. Рука незнаёмага ў кішэні). Я вот даведаюся, ці праўда. Калі хлусіш — зраблю табе канец. І крумкачы расцягаюць па лесе твае косці. (Дастае рэвальвер, упірае ў грудзі Віці)».

У прыведзеных урыўках адчуваецца надуманасць, яўная фальш. Відаць, аўтары ўзяліся апісваць справу, якой самі добра не ведаюць. Калі верыць аўтарам, дык шпіёны — проста пустагаловыя дурні. Яны без усякага супраціўлення, самі адлаюцца ў рукі маленькім дзецям. Хіба-ж бывае гэтак у сапраўднасці?

Такія творы толькі дэмабілізуюць чытача.

Павярхоўны падыход да тэмы, адарванасць ад жыцця прыводзяць да таго, што пісьменнікі капіруюць адзін другога, займаюцца перайманнем. Пераймаюцца не толькі асобныя месцы, а нават цэлыя абзацы, цэлыя старонкі.

Алесь Якімовіч у апавяданні «Выпадак на чыгунцы» заводзіць піонера ў лес. Ідзе піонер па палатну чыгункі і выяўляе, «што рэйкі на стыку расшрубаваны». Ён хутчэй бяжыць дадому, каб папярэдзіць крушэнне цягніка. Бяжыць, і раптам... сустракае незнаёмага.

«— Ты куды так ляціш?—пытаецца незнаёмы.

— Дамоў, рэйка там...»

Незнаёмы сапхнуў піонера з палатна чыгункі ў кусты, паваліў яго, звязаў і, каб хлопчык не мог нікога паклікаць на дапамогу, «запхнуў яму ў рот нейкую анучку».

Чытаючы апавяданне «Дружба» П. Левановіча, на восьмай старонцы знаходзім:

«— Дык куды-ж ты, хлопчык? Пойдзем разам.

— О, не! Мне трэба хутчэй. Там на лініі рэйка развінчана...

... Незнаёмы прыгнуўся, утаропіў вочы ў хлопчыка, і, хапіўшы рукой за горла, паваліў яго на траву... звязаў... выняў нейкую анучку і хацеў заткнуць Тарасіку рот, каб ён не крычаў...»

Дзіўнае супадзенне! Неяк не верыцца, каб яно атрымалася так сабе, выпадкова. А гэткія «супадзенні» можна сустрэць у творах маладых, асабліва пачынаючых, пісьменнікаў даволі часта. Развязкі апавяданняў у большасці выпадкаў перапісваюцца слова ў слова.

Сваё апавяданне «Выпадак на чыгунцы» А. Якімовіч заканчвае, прыкладна, так: «Праз некалькі дзён я атрымаў пісьмо. У ім камандаванне пагранчасці абвяшчала мне падзяку за дапамогу ў затрыманні буйнага шпіёна і дыверсанта адной суседняй замежнай дзяржавы».

Вазьміце апавяданне «Буська» М. Цэлеша і «Удодава гняздо» П. Левановіча. М. Цэлеш у канцы апавядання гаворыць: «Затрыманы аказаўся буйным шпіёнам адной суседняй дзяржавы». П. Левановіч зазначае: «Пасля выявілася, што незнаёмы аказаўся шпіёнам з-за мяжы» і г. д., і г. д.

Усе апавяданні на гэту тэму, змешчаныя за апошні год у «Піонер Беларусі», заканчваюцца гэтай збітай фразай.

Цікава спыніцца і на развязках апавяданняў А. Стаховіча. Нельга сказаць, каб А. Стаховіч капіраваў каго-небудзь. Ён робіць зусім інакш: кожны раз паўтарае самаго сябе. Чытайце яго апавяданне «У дажджлівы дзень». Вось апошнія радкі гэтага апавядання: «Абяззброены шпіён, звязаны вяроўкай, ляжаў на падлозе». Апавяданне «Дзед Юльян і Аркаша» заканчваецца словамі: «Яны ўзвалілі дыверсанта (вядома, звязанага—**Г. К.**) на санкі і панесліся на заставу». Трэцяе апавяданне— «Грышка-куравод» — Стаховіч заканчвае так: «Шпіён ляжаў нерухома...»

Не лішнім будзе яшчэ раз звярнуцца да апісання сустрэч дзяцей з незнаёмымі. Аказваецца, апісваючы гэта, ніяк нельга абысціся без слоў «стой, стой!» Гэтыя словы ўжываюцца кожным аўтарам і ў кожным апавяданні. Вось некалькі прыкладаў:

У Якімовіча — «Стой! Стой!—чуліся адтуль крыкі».

У Цэлеша — «Тут! Стой! Стой!»

У Левановіча — «Стой! Стой!.. — крычаў ён». «Стой! страляць буду!...»

У Стаховіча — «Стой! трымай яе!..» «Стой! страляць будзем!..» «Стой! Стой, падла!..»

Усё гэта даўно абрыдла дзецям. Але пісьменнікі ўсё-такі прадаўжаюць «частаваць» дзяцей нізкаякаснымі творамі, а рэдакцыі чамусьці друкуюць такія творы.

І пісьменнікам, і рэдакцыям, асабліва рэдакцыі газеты «Піонер Беларусі», час добра зразумець, што савецкія дзеці не паважаюць ніякай халтуры і мазні. Яны цікавяцца толькі глыбокімі і высокамастацкімі творамі. Такія творы ім і патрэбна даць. Трэба перайсці ад паказу «незнаёмых» да апісання таго, што пісьменніку добра знаёма, што ён вывучыў і добра зразумеў.

Некалькі слоў варта сказаць і аб назвах апавяданняў. Напісаў М. Лынькоў цікавую аповесць «Міколка-паравоз». Адразу-ж пасля гэтага ў рэдакцыі пачалі паступаць «Косці-чэкісты», «Колькі-чырвонаармейцы», «Грышкі-кураводы», «Санькі-цыркачы», «Юкі-партызаны» і г. д., і т. п. Аб чым гаворыць гэты, здавалася-б, нязначны факт? Зноў-такі аб тым, што той-сёй з пісьменнікаў займаецца перайманнем, капіраваннем, а не сапраўднай творчай работай.

Не відаць, каб маладыя пісьменнікі асабліва працавалі і над мовай сваіх твораў. Паўтарэнні асобных слоў, вельмі доўгія сказы, залішняе ўжыванне дзеепрыметных і дзеепрыслоўных зваротаў, устарэлыя эпітэты, параўнанні, стылістычныя няўвязкі характэрны для значнай часткі апавяданняў. Калі пісьменнік прыступае да малявання партрэта «незнаёмага», дык абавязкова, апісваючы яго вочы, ужывае эпітэты «страшэнныя», «лютыя», «пачырванелыя», рукі — «здаравенныя», наган — «цяжкі», «бліскучы», твар — «спалоханы», «скажоны», выгляд—«устрывожаны», «спалоханы» і г. д.

На творы Левановіча, Стаховіча і інш. былі напісаны невялічкія рэцэнзіі. Рэцэнзенты не палічылі патрэбным указаць маладым аўтарам на іх сур'ёзныя памылкі. Яны абмежаваліся кароткім пераказам твораў, агульнымі павярхоўнымі заўвагамі аб тэме, вобразах, мове, адзначылі, што тэматыка вельмі «актуальная і патрэбная». Зразумела, што такія рэцэнзіі вялікай карысці пачынаючым пісьменнікам не даюць.

ДЗВЕ ПАЭМЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

★

М. КАРПАЧОЎ

★

Амаль адначасова паявіліся ў друку дзве калектыўныя паэмы А. Жаўрука і А. Ушакова: першая —«Пра майго таварыша»— выйшла асобным выданнем у сектары дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР, другая — «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада»—надрукавана ў «Полымі Рэвалюцыі» № 12 за 1938 год.

Паяўленне гэтых паэм—радасная з'ява. Паэты Жаўрук і Ушакоў сваімі цікавымі, змястоўнымі паэмамі для дзяцей практычна давялі, што работа ў галіне дзіцячай літаратуры—такая-ж сур'ёзная і важная справа, як і работа ў галіне іншых жанраў мастацкай літаратуры.

Паэма «Пра майго таварыша» расказвае аб сяброўстве піонера нашай цудоўнай савецкай краіны з Педро, піонерам далёкай сонечнай Іспаніі. Дружба гэтых хлопчыкаў знітавана іх агульнай нянавісцю да фашыстаў-катаў, да генерала Франко, які знішчыў родны горад Педро—Авіла, знішчыў яго дом, пад руінамі якога пахаваны сястра і брат Педро. З расказа піонера СССР мы даведваемся:

Я не знаў іспанскай мовы,
Але гутарку да слова
Друга Педро разумеў,
Бо таварыш мой умеў
Пра мяцежнікаў-піратаў
Маляваць малюнкі так,
Што сціскаліся на катаў
Пальцы самі у кулак.

Іспанскі хлопчык Педро, пасля таго, як фашысты зруйнавалі яго родны горад, трапляе ў вольную краіну—СССР, дзе «дзецям—школы і палацы, дзецям—лепшыя сады, дзецям—пляжы, цеплаходы, малако і бутэрброды, і алоўкаў жмені ім...»

У Савецкім Саюзе сірата Педро знайшоў матчыну ласку, чулыя клопаты, знайшоў сапраўдную дружбу і бесклапотнае шчаслівае дзяцінства. Тут-жа, у піонерскім лагеры Артэку, Педро, як і ўсе шчаслівыя дзеці краіны соцыялізма, праводзячы час за гульнямі і дзіцячымі забавамі, не пакідае марыць аб вызваленні сваёй роднай Іспаніі ад бандытаў генерала Франко, марыць зрабіцца выдатным лётчыкам.

Дзеці-ж Савецкага Саюза мараць аб далёкіх пералётах, мараць стаць героямі, падобнымі Вадап'янаву, Папаніну.

А пакуль нам да пілотаў—
Мы не трацім дарма час,
І мадэлі самалётаў
Самі лётаюць у нас.

Вось, па сутнасці, аб чым расказваюць аўтары ў сваёй паэме. Расказваюць цікава, змястоўна, а галоўнае—сардэчна, цёпла, шчыра любячы тых, аб кім і для каго яны расказваюць.

Гульні савецкіх дзяцей—займальныя, змястоўныя. Нашы дзеці гуляюць у Чапаева, у папанінцаў, у бой каля возера Хасан.

Аб гульні ў папанінцаў і расказваюць паэты Жаўрук і Ушакоў у сваёй другой паэме «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада». Дзеці нашы жывуць гераічнымі падзеямі нашай краіны. І як толькі з дрэйфуючай крыгі вярнулася слаўная чацвёрка папанінцаў, дзеці пачалі гуляць у дрэйф на крызе на водах Паўночнага полюса, пачалі будаваць папанінскія палаткі, а кожнага сабаку абавязкова называць «Вясёлым».

«—Лёша быў Іван Папанін,
Таня — Крэнкель,
Я — Шыршоў,
А за Фёдарава — Танін
Меншы брат у нас сышоў.
Толькі «Жук» — шчанюк Міколы,
Усё адзіўляўся ад таго,
Што не «Жукам», а «Вясёлым»
Называлі ўсе яго.

Адважных малых папанінцаў з дзетсада фабрыкі «Дукат» наведалі сапраўдныя дарослыя дзядзі-папанінцы: Папанін, Крэнкель, Фёдараў і Шыршоў, якія «расказалі ўсё дачыста пра арктычныя ільды; пра палярныя таросы, пра сіберныя марозы, пра сваё жыццё-быццё, пра навукі развіццё».

Аўтары перадаюць расказ і пытанні дзяцей папанінцам надзвычай умела, памайстэрску. І пагэтаму дапытлівыя савецкія дзеці ўстаюць перад чытачом выразна, праўдзіва.

Яркая, вобразная мова паэмы сведчыць аб тым, што паэты ўмеюць ствараць жывыя, арыгінальныя вобразы. Такая страфа, як:

Дворнік люльку закурыў,
Быццам комін задыміў,
Акіянскім ледаколам
Да варот назад паплыў, —

запамінаецца і стварае добрае ўражанне аб знешнім выглядзе строгага, але адначасова і добрага дзядзі-дворніка.

Паэмы напісаны простай, вобразнай, зразумелай для дзяцей мовай. Чытаючы іх, адчуваеш, што аўтары гэтых твораў добра ведаюць псіхіку дзяцей, іх мары і думкі, умела выкарыстоўваюць класічную спадчыну.

Вось чаму мы настойліва рэкамендуем паэмы т. т. Жаўрука і Ушакова для школьнікаў малодшага ўзросту. Добра было-б, каб гэтыя дзве паэмы выйшлі асобным выданнем у адной кніжцы школьнай серыі мастацкай літаратуры.

АПАВЯДАННІ ПАЎЛА ЛЕВАНОВІЧА

Некалькі месяцаў назад паступіў у продаж зборнік апавяданняў Паўла Левановіча для дзяцей «Дружба».

Апавяданні маладога пісьменніка можна падзяліць на дзве групы: апавяданні пра затрыманне парушальнікаў граніцы і апавяданні аб з'явах прыроды.

У апавяданнях пра затрыманне шпіёнаў («Дружба» і «Удодава гняздо») П. Левановіч паказвае адвагу савецкіх людзей, іх адданасць радзіме. Герой апавядання «Дружба» хлопчык Тарасік гатовы афяраваць сваім жыццём, каб толькі выратаваць цягнік. Нават моцна збіты незнаёмым чалавекам, ён не турбуецца і з усёй рашучасцю савецкага патрыёта змагаецца з дыверсантам.

Дрэнна толькі, што ў абодвух гэтых апавяданнях дзеці дапамагаюць затрымліваць парушальнікаў зусім выпадкова.


...Тарасік бяжыць па рэйцы і раптам ледзь не падае на шпалы: рэйка аказалася развінчанай. Убачыўшы гэта, ён бяжыць разам з сабакам да чыгуначнага рэманцёра Ігната. Сабака падбягае да капы і выцягвае з яе клумак, у які разам з іншымі рэчамі ўкручан наган. Тарасік кладзе наган сабе ў кішэню, але баючыся, каб ён не выстраліў, хоча схаваць яго ў другую капу. Ён садзіць руку ў капу і адчувае штосьці цёплае. Гэта быў твар шпіёна.

Так П. Левановіч паказвае затрыманне парушальніка граніцы ў апавяданні «Дружба».

Дзеці надта цікавяцца граніцай, але П. Левановічу трэба зразумець, што такіх выпадкаў не бывае, калі чалавек затрымлівае парушальніка граніцы, прайшоўшы праз цэлую сістэму незвычайных здарэнняў. У яго герояў ніякай пільнасці няма—усё пабудавана на выпадковасці.

У апавяданні «Удодава гняздо» хаця і адчуваецца такая самая выпадковасць, але ў меншай мары. У чытача застаецца добрае ўражанне аб гэтым апавяданні.

Трэба сказаць, што П. Левановіч любіць прыроду, добра ведае яе. Героі яго



Скульптура лётчыцы, устаноўленая на комсамольскім скверы гор. Магілева.

Фотахроніка БЕЛТА.

апавяданняў любяць усё жывое. Так, герой апавядання «Вулей» ледзь не плача, калі даведваецца, што сабаку «Морсіка» пакусалі чмялі. У апавяданні «Сарока-белабока» Валодзя шкадуе ката, які праглынуў мяса з кручком на нітцы. Панасік клапатліва даглядае любімага быка Шэрака, пабітага другім быком. І, урэшце, герой апавядання «Капкан на дрэве» шкадуе знішчаць маленькіх каршунят таму, што, на яго думку, яны ні ў чым не вінаваты. Ён лічыць шкоднікамі толькі старых каршуноў.

У аснову апавяданняў пра прыроду П. Левановіч бярэ самыя звычайныя здарэнні. Для прыкладу можна прывесці апавяданне «Хамелеон». Аўтар расказаў у ім пра жыццё жывёлінкі хамелеона. Атрымаўся цікавы літаратурны твор. Таксама можна ўзяць апавяданні «Пра вавёрачку і кошку» і «Рагаты прыгажун».

Апавяданні П. Левановіча напісаны цёпла і проста. Праўда, у некаторых апавяданнях сустракаюцца асобныя абзацы, якія можна выкрэсліць і цэласць твора не нарушыцца. Навошта спатрэбілася аўтару расказваць (апавяданне «Паласатая кошка»), як ён выйшаў вечарам на паляванне, а праз некалькі хвілін вярнуўся назад, нічога не зрабіўшы. Тым больш гэта непатрэбна, што на наступны дзень аўтар зноў ідзе па той-жа дарозе.

Не гледзячы на тое, што малады пісьменнік нядрэнна валодае мовай, часам у яго сустракаюцца недапрацаваныя сказы, як: «Над лугамі стаіць мядовы гуд». Гуд, вядома, мядовым быць не можа. Так пісаць нельга. Аднак, пры ўсім гэтым, кніга будзе карыстацца поспехам у дзяцей.

Аляксандр ПАРМОН.

В. БАРЫСЕНКА

Творчасць Дуніна-Марцынкевіча

Дунін-Марцынкевіч фарміраваўся і развіваўся як пісьменнік пад уплывам рускай культуры і літаратуры, пад моцным уздзеяннем беларускага фальклору. Яго літаратурнымі настаўнікамі былі Карамзін і Жукоўскі.

Распачаўшы сваю літаратурную дзейнасць у канцы першай палове XIX стагоддзя, амаль на саракавым годзе жыцця, пісьменнік стварыў многа твораў, галоўнейшыя з якіх наступныя: «Сялянка»—1846 год, паэма «Гапон»—1855 год, вершаваныя апавяданні «Вечарніцы»—1855 год, «Шчаўроўскія дажынкі»—1855 год, «Купалле»—1856 год, камедыі «Пінская шляхта»—1866 год, «Залёты»—1870 год і рад паасобных вершаў. Дуніну-Марцынкевічу належыць пераклад на беларускую мову «Пана Тадэуша» Адама Міцкевіча.

Дунін-Марцынкевіч, адзін з найбольш буйных беларускіх пісьменнікаў дарэформеннага часу, з'яўляецца прадстаўніком сантыментальнага напрамку ў беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя.

Сантыментальны напрамак паявіўся на Беларусі значна пазней, чым у заходне-еўрапейскай і рускай літаратуры. Сантыменталізм не разгарнуўся ў беларускай літаратуры ў шырокую плынь, а закрануў толькі творчасць двух-трох пісьменнікаў. У Дуніна-Марцынкевіча сантыменталізм не насіў рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару і прыстасоўваўся да дваранскай ідэалогіі. Палітычныя і грамадскія погляды Дуніна-Марцынкевіча былі ў аснове сваёй кансерватыўнымі і рэакцыйнымі. Захаваць прыгон, але ўдасканаліць яго і зрабіць своеасаблівым «раем», дзе адносіны паміж селянінам і панам трымаліся-б не на пачатках сілы і прымусу, а на асновах узаемнага разумення, гуманнасці і любві,—вось асноўныя задачы, якія ставіў перад сваёй творчасцю пісьменнік. Дунін-Марцынкевіч спадзяваўся, што прыклад культурных і «добрых» памешчыкаў сваім уздзеяннем на астатніх прыгоннікаў можа прывесці да паляпшэння становішча сялянства.

Асноўныя прынцыпы Марцынкевіча выражаны і вызначаны самім аўтарам у яго выказваннях аб характары і задачах уласнай творчасці. Перад сваёй творчасцю пісьменнік ставіў дзве задачы: выклікаць у памешчыка гуманныя, чулыя адносіны да селяніна, выхаваць у прыгонным сялянстве пачуццё павагі і любві да памешчыкаў.

Першы твор Марцынкевіча «Сялянка» па характару сваёй тэматыкі і асноўных момантах сюжэта ва многім нагадвае «Барышню-крестьянку» Пушкіна і бясспрэчна напісан пад яго непасрэдным уплывам.

Цяга да закінутага маёнтка, ідэалізацыя сельскай прастаты і ціхага, мірнага вясковага жыцця, якія спалучаюцца з адмоўнымі адносінамі да шумнага вялікасвецкага грамадства і горада, мацней за ўсё сказваюцца ў гэтым творы Дуніна-Марцынкевіча.

Малады памешчык Лятальскі—асноўны герой «Сялянкі». У пачатку твора Лятальскі малюецца як адмоўны тып. Ён пакідае роднае гняздо і, як гэта модна было ў тыя часы ў багатых дваранскіх сем'ях, адпраўляецца за граніцу, дзе жыве доўгі час і захапляецца заходняй цывілізацыяй. Вось гэтага «адшчапенца», «франкамана» стаўляе на шлях ісціны Юля, дачка Яна Драбовіча, ранейшага апекуна Лятальскага. Лятальскі праз каханне да Юлі (якую паніч на першых парах прымае за простую сялянку) прыходзіць да ўсведамлення свайго «асноўнага доўга» перад сялянамі: быць добрым памешчыкам. Сэнс і мэту свайго жыцця Лятальскі бачыць у клопатах аб падуладных яму сялянах.

Ужо ў першым творы Марцынкевіча даецца супроцьстаўленне жыцця перасычанага раскошай «адшчапенца»-памешчыка Лятальскага жыццю Юлі, якую пісьменнік лічыць носьбітам дваранскай чэсці і доўгу, захавальнікам патрыярхальных традыцый.

Такія самыя матывы характэрны і для многіх вершаваных апавяданняў Марцынкевіча. Паэма «Гапон» распрацоўвае ў сантыментальным плане гуманістычную тэму. Сюжэт паэмы не новы, а традыцыйны для сантыментальна-рамантычнай заходне-еўрапейскай і рускай літаратуры. У аснову сюжэта пакладзен матыў сумнай, доўгай разлукі двух любячых сэрцаў і іх шчаслівай сустрэчы. Дзеянне, апісваемае ў творы, разгортваецца ў беларускай вёсцы часоў прыгону.

Марцынкевіч не падымаецца ў названым творы да праўдзівага раскрыцця жудасці прыгонніцтва. У асобных толькі выпадках пісьменнік абмяжоўваецца паказам эпізодаў і малюнкаў, якія ў некаторай меры характарызуюць цяжкасць прыгоннай працы і свавольства панскіх служак. Вобраз панскага эканома найбольш рэалістычны, праўдападобны вобраз у творы.

У творы «Купалле» граматнаму мярэтніку-пісару супроцьстаўляецца благанраўная Агата.

У бессюжэтным творы «Шчаўроўскія дажынкі» на фоне шырокага паказу сельскагаспадарчага свята дажынак больш войстра падкрэсліваецца нібыта існуючая, па ўяўленню Марцынкевіча, гармонія класавых інтарэсаў у асяроддзі прыгоннай вёскі.

У адным з раздзелаў твора «Шчаўроўскія дажынкі» аўтар параўноўвае і вызначае якасці трох жонак—князя, пана і селяніна. Першая характарызуецца як няўмека ў гаспадарскіх справах і падакучлівая для мужа. Другая—панская жонка — распусная і ілжывая, ашуквае свайго мужа. А на трэцюю—жонку селяніна—аўтар указвае як на ідэальную жанчыну. Сялянка—шчырая, працавітая, «у боязні бога, пакорная, ціхая, для мужа верная».

У якасці асноўных дзеючых асоб у творах Марцынкевіча падаюцца вобразы памешчыкаў, прадстаўнікоў прыгоннага сялянства і панскіх служак.

Падыход да паказу памешчыцкіх вобразаў дыктаваўся і абумоўліваўся грамадскімі і эстэтычнымі прынцыпамі пісьменніка. Паэт у гэту эпоху ломкі феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі і разлажэння феадальнага грамадства шукаў выйсця з крызіса прыгоннай гаспадаркі не ў напрамку яе ліквідацыі шляхам рэвалюцыі, а ў маральным самаўдасканаленні памешчыкаў і «культурнага» сялянства.

Пан з твора «Шчаўроўскія дажынкі» як дзве кроплі вады падобны да пані з твора «Гапон». «Паніч маладзенькі—сэрцам залаценькі»—такімі словамі пачынаецца характарыстыка шчаўроўскага памешчыка.

Зусім зразумела і бясспрэчна, што вобразы памешчыкаў, намаляваныя Дуніным-Марцынкевічам, антырэалістычныя, далёкія ад праўдзівасці. Але тут нельга не падкрэсліць адну істотную рысу ў творчасці пісьменніка, а іменна, што скрозь гэтыя, не адпавядаючыя гістарычнай праўдзе, вобразы голасна чуюцца гуманістычныя матывы і настойлівае патрабаванне чалавечых, чулых адносін да селяніна. У суровы век Салтычых гэтыя гуманістычныя матывы былі дадатнай якасцю.

Шырока прадстаўлены ў Марцынкевіча вобразы прыгонных сялян.

Ідэальнай сялянкай паказваецца Кацярына ў творы «Гапон». Кацярына ў многім нагадвае нам Лізу з твора «Бедная Лиза» Карамзіна. Кацярына—прыгожая сялянская дзяўчына, якая глыбока кахае прыгоннага хлапца Гапона.

Кроткая і пакорлівая Кацярына нават да тых, хто яе крыўдзіць, у прыватнасці да панскага эканома, адносіцца пахрысціянску. Яна ніколі не скардзіцца на цяжкое жыццё прыгоннай сялянкі. Такі вобраз ідэальнай сялянкі малюецца ў многіх творах Марцынкевіча, у прыватнасці ў творы «Вечарніцы».

У такім-жа выглядзе ўстаюць перад намі і мужчынскія вобразы, узятыя з асяроддзя прыгоннага сялянства. Возьмем хаця-б Ананія з твора «Вечарніцы». Ананій—стары селянін, бедны і голы, але жыццярадасны і бадзёры. На старасці год «у карчму ўжо не хадзіў, лапці плёў, бога хваліў і казачкі размаўляў».

Творы Марцынкевіча ў цэлым і асабліва старонкі, прысвечаныя паказу сялянства, прасякнуты шчырым чалавечым пачуццём. У народнай масе бачыў пісьменнік носьбітаў здаровых фізічных і духоўных пачаткаў, фізічнай і маральнай стойкасці, сілы і прыгожасці. Не заўважаючы і не паказваючы жабрацтва, абяздоленасці, цемры і забітасці сялянства, Марцынкевіч затое пільным вокам мастака бачыў і адлюстроўваў пры падачы сялянскіх вобразаў унутраную прыгажосць, благародства, шчырасць і чыстату адчуванняў і перажыванняў, учынкаў і дзеянняў людзей з народа. З гэтага боку і ў такім плане народны свет ні ў аднаго з беларускіх пісьменнікаў да Марцынкевіча не паказваўся.

Марцынкевіч адным з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да паказу ўнутранага зместу чалавечай душы, да псіхалагічных зарысовак. Але цікава, што вобразы людзей у творчасці пісьменніка не пазбаўлены ўмоўнасцей, якія выкліканы вузкасцю і абмежаванасцю эстэтычных прынцыпаў аўтара. У эстэтычную канцэпцыю аўтара ўвайшлі некаторыя з істотных палажэнняў эстэтыкі класіцызма. У творчасці Марцынкевіча мы часта маем рэзкі і часамі грубы падзел герояў на дзве крайнія процілеглыя групы. Кожны з вобразаў аўтара з'яўляецца ўвасабленнем альбо парокаў, альбо добрачыннасцей. Так, напрыклад, Кацярыне і Гапону ў творы «Гапон» супроцьстаіць носьбіт парокаў—эканом, Касі з твора «Вечарніцы» супроцьстаіць вобраз Марфы і г. д.

Такім чынам пэўная вузкасць падыходу пры падачы вобразаў не падлягае аспрэчванню і абумоўлена абмежаванасцю аўтарскіх уяўленняў аб чалавеку.

Але для Марцынкевіча, як сантыменталіста, характэрна тое, што ён канструіруе і раскрывае вобраз інакш, чым класіцысты. Войстрае падкрэсліванне дэталей, смелы паказ звычайных з'яў, што ўласціва еўрапейскаму і рускаму сантыменталізму, уласціва і Дуніну-Марцынкевічу.

Адштурхоўваючыся ад напышчана-урачыстай, узвышанай лексікі класіцызма, перасыпанай царкоўна-славянщчынай, Марцынкевіч досыць шырока і ўдала карыстаецца народнай мовай. Яго паэтычная мова ў цэлым, як і паасобныя слоўна-паэтычныя прыёмы, у прыватнасці метафары, параўнанні, эпітэты, гіпербалы і г. д., і т. п., маюць канкрэтна-акрэслены вобраз і рэалістычны характар. Вобразы для стылістычных прыёмаў чэрпаюцца пісьменнікам перш за ўсё з галіны беларускай прыроды, быту беларускай вёскі і рознастайнага багацця беларускай народнай творчасці.

Нямалае месца займаюць у славеснай сістэме аўтара фальклорныя ўвасабленні, гіпербалы, сінтаксічныя паралелізмы, самыя рознастайныя рытарычныя фігуры і г. д.

Мова пісьменніка насычана народнымі прыказкамі, прыслоўямі, сакавітымі выразамі і г. д. («п'янаму мора па калена», «працавіта, як муравейка», «здаровая, як баравы рыжок», «ад ліха ціха і дабра не чуць» і інш.). Фальклорны струмень у паэтыцы аўтара пераплятаецца з разгаворным. Аднак насычанасць лексікі памяншальна-ласкальнымі словамі стварае салодкава-сантыментальны характар мовы аўтара.

Улюбёным жанрам пісьменніка можна лічыць кароткую вершаваную навелу, паэму, чуллівую аповесць альбо кароткую аповесць жартаўлівага характару. У такога роду паэтычных жанрах сканцэнтрыраваны асноўныя стылевыя асаблівасці мастацкай манеры пісьма аўтара.

Апрача вершаваных аповесцей, паэм, апавяданняў, пісьменніку належаць дзве драматычныя рэчы—камедыі «Пінская шляхта» і «Залёты». Фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» напісан у 1866 годзе. Завязка твора—спрэчка Пратасавіцкага і Лінскага. Аўтар высмейвае норавы засцянковай шляхты. П'еса ў многім нагадвае вядомы твор Гогаля «Как поссорился Иван Иванович с Иваном Никифоровичем».

Другой камедыяй Марцынкевіча з'яўляюцца «Залёты». У вобразе Сабковіча малюецца кулак-драпежнік парэформеннай пары. Сабковіч—продак шчадрынскіх герояў тыпу Калупаева і Разуваева. Гэта надзвычай грубы, наглы і цынічны эксплаататар, які нажываецца на разарэнні і эксплаатацыі сялянства і не спыняецца перад самымі наглымі і цынічнымі спосабамі нажывы. У гэтых адносінах вельмі характэрнай і паказальнай з'яўляецца сцэна разліку Сабковіча з парабчанкай. Згодна падліку Сабковіча атрымоўваецца, што не ён павінен заплаціць за гадовую службу ў яго парабчанцы, а парабчанка павінна яшчэ даплаціць яму, Сабковічу. Такім-жа парадкам ашуквае Сабковіч і столяра Мардку, скруціўшы апошняму заработаныя грошы. «Хай гэта мая ўбогая і крывавая праца,—кажа столяр у вочы ашуканцу,—застанецца пану на хаўтуры».

На папрокі акружаючых, што ў Сабковіча ў душы няма сумлення, апошні абвяшчае ўсякія развагі аб сумленні брахнёй. Хто багаты, таго ўпаўнена,—заяўляе Сабковіч,—прызнаюць і сумленным і разумным. «Каб я не меў розуму, то і грошай не сабраў-бы».

Творчасць Дуніна-Марцынкевіча адыграла значную ролю ў развіцці беларускай літаратуры і беларускай мовы.

Ю. Віцьбіч

АПАВЯДАННЕ ШАЎЦА СУРДЗІНА

(Канец)

сваіх сабак пастанавіў помнікі, а якія помнікі стаяць над нашымі салдацкімі магіламі ў Карпатах, у Турцыі, у Беларусі?—крычыць рослы, з вялікай рыжай барадой, салдат-сібірак з 23-й Каранной дружыны.

І адразу-ж усё сціхла, калі пачаў гаварыць наш таварыш Кагановіч.

— Таварышы рабочыя і салдаты, вось гэтыя панове,—сказаў ён, з пагардай паказваючы на соцыял-гадаў, — хочуць «ратаваць» рэвалюцыю. Ад каго яны збіраюцца яе ратаваць? Ад піцерскіх рабочых, якія ўсцялілі сваімі трупамі брук петраградскіх вуліц у 1905 годзе і цяпер? Разам з памешчыкамі Радзянка і Гучковым яны збіраюцца ратаваць рэвалюцыю ад нас, рабочых.

Прапанова соцыял-гадаў правалілася. Сход выбраў прапанаваны Палескім камітэтам большэвікоў «Камітэт Рэвалюцыйнай Абароны Кастрычніцкіх заваёў», які пачаў запіс у Чырвоную Гвардыю. Я і Абрам, зірнуўшы спачатку адзін на другога, потым на таварыша Кагановіча, падышлі да століка, дзе запісвалі, і сказалі:

— Запішы ў Чырвоную Гвардзію таксама нас, шаўцоў з майстэрні Бенцмана.

На гэтым самым сходзе мы даведаліся і самі пераканаліся, што наш таварыш Лазар Майсеевіч Кагановіч—чалавек асаблівы, што большэвіцкая партыя паслала яго арганізоўваць гомельскіх рабочых і салдатаў на барацьбу за Совецкую ўладу і што гэта ён кіраваў кастрычніцкімі баямі ў нашым Гомелі.

Некалькі разоў яшчэ заходзіў к нам у майстэрню наш Лазар Майсеевіч. Зайшоўшы ў апошні раз, сказаў:

— Пашыйце мне, таварышы, боты. І калі можна, дык найхутчэй. Мяне пераводзяць адсюль у Магілеў.

Знімаю мерку я з нагі, яшчэ добра запомніўся высокі пад'ём, і гавару:

— Нашто табе, Лазар Майсеевіч, ехаць ад нас? Ты-ж цяпер у нас, у Гомелі, самы галоўны. Старшыня Палескага камітэта большэвікоў.

— А ты яшчэ, таварыш Сурдзін, не зусім свядомы,—адказвае мне таварыш Кагановіч.—Большэвік—гэта той-жа салдат. Ён павінен выконваць усе загады сваёй партыі і ехаць туды, куды яна яго пасылае.

Усёй майстэрняй шылі мы гэтыя боты. Цвік да цвіка падбіралі і кожны з іх у сваё месца заганялі, дратву мацнейшую за дрот сучылі, усцельку мяккую, як пух, клалі. Боты атрымаліся векавечныя, зносу ім не будзе, але паслалі мы іх ужо ў Магілеў.

І нават не верыцца, што гэтыя боты мы шылі дваццаць год таму назад. Таварыш Кагановіч за гэты час працаваў на адказнай партыйнай і совецкай рабоце ў Магілеве, Ніжнім-Ноўгарадзе, Варонежы, Ташкенце. Працаваў на Украіне і цяпер у Маскве. У сваёй вялізнай рабоце ён сустракаўся з тысячамі людзей. Здавалася, дзе яму запомніць мяне. Але летась адзін гомельскі машыніст, прыехаўшы з нарады знатных чыгуначнікаў, у першы-ж дзень прышоў на нашу абутковую фабрыку «Праца». Адшукаўшы наш цэх і стаханаўскую брыгаду, ён падышоў да мяне і кажа:

— Калі таварыш Кагановіч даведаўся, што я з Гомеля, дык, распытаўшы пра новы, соцыялістычны Гомель, пра яго прадпрыемствы і знатных людзей, сказаў:—Перадайце ад мяне прывітанне і таварышу Сурдзіну. Калісьці разам у Бенцмана працавалі.

Перадае машыніст, усміхаючыся, цёплае прывітанне маршала нашых вялізных заводаў і бясконцых чыгунак, а мне адразу перад вачмі ўсё зацягнула туманам. Можа, гэта і сорамна для дарослага, заўсёды вясёлага шасцідзесяціпяцігадовага грамадзяніна, але я заплакаў.

Віцебск. 1939.



Брыгада Тэатра юнага гледача БССР у піонерскім лагеры. Артысты выконваюць «Курортную песню». Фото С. Гуца.

ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА Ў ПІОНЕРЛАГЕРАХ

З 8 ліпеня Тэатр юнага гледача імя Н. К. Крупскай пераключыўся на абслугоўванне піонерлагераў. Падрыхтаваная ім канцэртная праграма значна лепшая ў параўнанні з праграмай мінулага года. У праграму, у прыватнасці, уваходзіць вадэвіль «Пераможцы», напісаны маладымі беларускімі драматургамі Ю. Рудзько і В. Стальмахам. Пры тэатры створан тэатралізаваны джаз пад кіраваннем В. П. Белкіна. У праграме джаза — сатырычная казка «Акула» Маршака, «Куплеты вадавоза» з фільма «Волга-Волга», «Все хорошо» Набатавых, мастацкае чытанне «Двадцатилетний», тэатралізаваная руская народная песня «Калінка», фізкультурны танец і рад іншых нумароў.

Першыя 8 канцэртаў у піонерлагерах Менскай вобласці атрымалі добрую ацэнку.

З другой паловы ліпеня тэатр выязджае для абслугоўвання піонерлагераў у іншыя вобласці Беларусі.

С. ГУЦ.

КАЛГАСНЫ ДРАМГУРТОК

Ужо некалькі год у калгасе «Перамога», Кавалёўскага сельсовета Бабруйскага раёна існуе драматычны гурток. Гурток налічвае 15 удзельнікаў, большасць якіх — моладзь.

За час сваёй работы драмгурток паказаў калгаснікам пастаноўкі: «Сваты» І. Гурскага, «Радзіма» Б. Левіна, «Валасны суд» А. Чэхава, «Пад дзікай яблыняй» Е. Раймонд і інш. Драмгурток карыстаецца вялікім аўтарытэтам не толькі сярод калгаснікаў свайго калгаса, яго любяць і паважаюць калгаснікі ўсяго сельсовета. Асабліва добра выконваюць свае ролі драмгуртkоўцы-комсамольцы т.т. Позняк Алесь, Харанека Сцяпан, Сакун Іван, Каляснiцкая Валя.

Зараз драмгурток прыступіў да работы над п'есай «У пушчах Палесся» Якуба Коласа.

Міх. ПУХАЛЬСКІ.

КАНЦЭРТЫ Ў КАЛГАСАХ

Менскае абласное ўпраўленне па справах мастацтваў арганізуе фестываль музыкі ў калгасах. У калгасы Заслаўля, Дзяржынска, Барысава выедзе 5 брыгад лепшай мастацкай самадзейнасці гор. Менска, хор і аркестр народных інструментаў Радыёкамітэта, духавы аркестр клуба працаўнікоў асветы.

Усяго будзе дадзена 15 канцэртаў. Для калгаснікаў будуць прачытаны даклады і лекцыі аб музыцы.

Літаратурная пародыя

А. УШАКОЎ.

ВОГНЕННА-АГНІСТАЯ...

Пагляд, якая вогненная,
Раз'агністая гара.
У небе вогненным на вогнішчы
Зоры вогненна гараць.
Ветры вогненна табунамі
Праляцелі... Наўсцяж агні.
Вечар горача за намі
Мчыць на вогненным кані.
Прыхадзі, мая агністая,
Сцежкай зорнаю, агнявой.
Ночку вогненна-імглістую
Прасядзім удвух з табой.

Павел ХАДАРЭНКА.



«Голубые скалы» у Тэатры музкамедыі БССР. Кавалёў, альпініст — арт. А. Мартаў; Таня, аспірантка — арт. Э. Тарасава.

Фота І. Каплінскага.

Другая кніга альманаха „Дружба народов“

Альманах «Дружба народов» па праву носіць сваю назву. У кнізе, у якой ўсяго 372 старонкі, надрукаваны творы 28 аўтараў, перакладзеныя з 13-ці нацыянальных моў братніх рэспублік. Побач з раманам украінскага пісьменніка Сямёна Скляранка «Мікола Шчорс», у якім апісана геройчная барацьба ўкраінскага народа ў 20-х гадах XX стагоддзя супроць Петлюры, Дзенікіна, бандыцкіх зграй і нямецка-польскіх акупантаў, — надрукаван геройчны армянскі эпас «Давід Сасунскі», які апісвае барацьбу армянскага народа супроць іншаземных арабскіх прыгнятальнікаў у 40-х гадах X стагоддзя. Побач з вершам беларускага паэта Аркадзія Куляшова «Калгасная восень» (урывак з паэмы «У зялёнай дуброве») — аб маладой калгасніцы, аб старым калгасніку, што едзе на Далёкі Усход да параненага сына-пагранічніка, аб залатых асенніх днях — надрукавана апавяданне грузінскага драматурга і празаіка Шалва Дадзіані «Дзень паэта», якое пераносіць нас у XIII стагоддзе і паказвае вялікага грузінскага паэта Шота Руставелі. Побач з калмыцкім геройчным эпасам «Джангар» — аб трох хлопчыках-храбрацах, якія аказалі вялікую паслугу свайму народу, — надрукаваны лірычныя вершы з цыкла «Вішня цвіце» яўрэйскай паэтэсы Рахілі Боймвал — аб ластаўцы, аб парусе, аб каханым.

Альманах «Дружба народов» мае тры раздзелы: мастацкай літаратуры, народнай творчасці і крытыкі і публіцыстыкі. Акрамя пералічаных вышэй твораў у альманаху надрукаваны вершы Сулеймана Стальскага, вершы татарскіх паэтаў Шэйхі Мannур і Ерыкеева, апавяданне абхазскага пісьменніка Георгія Гулія, цыкл лірычных вершаў армянскага паэта Ованес Шыраза, вершы яўрэйскіх паэтаў БССР Камянецкага, Ліўшыца, Каган, байкі беларускага пісьменніка Крапівы, апавяданне яўрэйскага пісьменніка Гадзінера, артыкулы М. Клімковіча, Івана Малчанава, Умуд Гусейна і шмат іншых твораў.

Альманах адкрываецца новымі вершамі Стальскага. З кожным яго новым вершам усё больш і больш адчуваеш, які вялікі талент страціла чалавецтва. Кожны верш «Гамера XX стагоддзя» ўсё больш пераконвае ў тым, якім па сапраўднасці велізарным розумам валодаў гэты просты, непісьменны акын. У вершы «Комуніст» Стальскі піша:

Чтоб коммунистом быть — иди
Дорогою прямой, товарищ.
Будь самых первых—впереди,
Будь правдою самой, товарищ!

І далей:

Гончар—он в глине чудодей.
Кузнец—он знает суть гвоздей.
Не будь невеждой: для людей
Стань светом, а не тьмой, товарищ!

(Пераклад С. Л'пк на).

Вельмі цікавы па сіле і шчырасці пачуццяў верш Шэйхі Маннур «Ад усяго сэрца». Верш татарскага паэта прасякнут вялікай любоўю да радзімы і правадыра народаў таварыша Сталіна. Паэт у заключнай страфе ўсклікае:

О, песня!
Окрылись и по дороге длинной
Из сердца птицею лети к окну его.
Неси ему привет
И благодарность сына,
Сливаясь с песнями народа моего!

(Пераклад А. Мініх).

Пераклікаючыся з Шэйхі Маннур, малады армянскі паэт Ованес Шыраз гаворыць, звяртаючыся да правадыра:

Зачем нам вечная весна, когда на свете ты живешь?
Заря бессмертная ясна, как солнце, ты нам жизнь даешь!

(Пераклад Веры Звягінцавай).

У альманаху надрукавана адзінаццаць вершаў Шыраза. Шыраз яшчэ зусім малады паэт, але яго вершы знайшлі прызнанне ў шырокіх кругах чытачоў, яны прасякнуты вялікай удумлівасцю, лірызмам і любоўю да прыроды. Творчасць Шыраза пераклікаецца з багатай народнай паэзіяй Арменіі і з творчасцю класікаў армянскай літаратуры—Туманяна і Ованесяна. Зараз малады паэт працуе над паэмай аб Сталіне.

Раман Сямёна Скляранка «Мікола Шчорс» з'яўляецца другой кнігай трылогіі аб геройчнай вызваленчай вайне украінскага народа. Першая кніга «Дарога на Кіеў» паявілася на рускай мове ў мінулым годзе. У рамане «Мікола Шчорс» добра дадзены вобразы Шчорса, Бажэнка і іх баявых саратнікаў. Вельмі прывабны вобраз селяніна-бедняка Сілы Жэрдзягі і яго сына, байцоў геройчнага Багунскага палка. У кнізе дадзена цэлая галерэя людзей з народа, а таксама намаляваны вобразы афіцэраў-дзенікінцаў і іншых ворагаў социялізма. З праўдзельнай яснасцю апісана здрадніцкая контррэволюцыйная дзейнасць Іуды Троцкага.

Мы думаем, што раман таленавітага украінскага пісьменніка знойдзе добры прыём у чытача.

У кнізе «Дружба народов» досыць шырока прадстаўлены пісьменнікі, якія працуюць у Беларусі. Асабліва радасна, што многія з іх амаль упершыню перакладзены на рускую мову. Але пераклады прымушаюць жадаць лепшага.

Альманах «Дружба народов» павінен быў мець добрыя пераклады, але гэтага, нажаль, няма. Пытанне аб якасці перакладаў неаднаразова падымалася нашым друкам. Шмат разоў адзначалася дрэнная якасць перакладаў.

Пры выхадзе першай кнігі альманаха таксама шмат гаварылася аб дрэннай якасці перакладаў паэтычных тэкстаў.

З яўрэйскіх паэтаў лепш за ўсіх перакладзена Рахіль Боймвал. Гэта і зразумела. Яе вершы перакладала Вера Інбер. Дрэнная якасць перакладаў часцей за ўсё тлумачыцца тым, што пераклады даручаюцца няздольным людзям, якія не маюць ніякіх адносін да паэзіі, ці паэтам, якія самі пішуць дрэнна.

З беларускіх пісьменнікаў няпрэнна перакладзен Крапіва (пераклад Арго). Пераклад урыўка з паэмы Куляшова зроблен Семыніным вельмі нароўна. Побач з добра перакладзенымі строфамі сустракаюцца вельмі няўдалыя. Не зусім здавальняе мова перакладу. Перакладчык з-за рыфмы «небо» пакідае беларускае слова «трэба». У рускай мове такога слова няма.

Альманах дае кароткія звесткі аб аўтарах. Звесткі аб некаторых пісьменніках не зусім правільныя (напрыклад, аб Сары Каган, Камянецкім і інш). Рэдакцыі трэба ўважлівей правяраць гэтыя звесткі.

Нам хочацца прапанаваць рэдакцыі ўвесці ў альманах раздзел «Трыбуна пісьменніка». Такі раздзел быў-бы вельмі да месца. У ім пісьменнікі нацыянальных рэспублік маглі-б расказаць аб сваёй рабоце, аб творчасці сваіх таварышоў, аб якасці перакладаў і аб многіх іншых хвалюючых іх пытаннях, якія маюць значэнне для ўсёй совецкай літаратуры.

А. КУПЕРШТОК.

„Привидения“

(Да пастаноўкі ў Ленінградскім тэатры імя Ленсовета)

«... Пройдзе не так ужо многа часу, покуль добрыя людзі ў нас на радзіме ўцямяць п'есу. А ўсе гэтыя ўсохшыя муміі, аджыўшыя клячы, якія накінуліся на маю п'есу, калі-небудзь ды будуць сурова асуджаны гісторыяй літаратуры...» Так пісаў у 1882 годзе Г. Ібсен свайму выдаўцу Гегелю аб крытыцы п'есы «Привидения».

Фру Альвінг некалі пакінула распусніка мужа, за якога выйшла замуж дзякуючы стаpанням сваякоў. Хутка, пад уплывам пастара Мандэрса, яна вярнулася назад, але гэта падпарадкаванне абавязку паслужыла пачаткам драмы жанчыны, трапіўшай у павуціне халзячых поглядаў паказной маралі, якія як здані снуюць паміж людзьмі.

Яна ведала, што кожная пляма, якая ляжа на яе мужа, будзе падвойнай плямай на ёй, бо яна жонка, якая ўцякала. Яна хавае ад усіх распуснасць свайго мужа, але прыходзіць час і яна вымушана расказаць і сыну, і пастару Мандэрсу праўду аб ім.

Яна пазбавіла сябе матчыных радасцей і адправіла з дому сына, каб ён не ведаў праўды аб бацьку, яна маніла сыну, малюючы яму ў пісьмах бацьку, як чалавека высокай маралі. Але сын варочаецца дадому і яна даведваецца, што ён нясе ў сабе пагрозу вар'яцтва — вынік бацькоўскай распусты.

Яна зрабіла ўсё, каб захаваць распусту мужа з пакаёўкай, выдаўшы яе замуж. Яна захавала ад усіх, што Рэгіна — вынік блуду яе мужа з пакаёўкай. але Освальд хоча ажаніцца з Рэгінай, і яна вымушана расказаць праўду і Освальду, і Рэгіне, і пастару Мандэрсу.

Карацей кажучы, доўгія годы пакутнага «маральнага» жыцця канчаюцца тым, што фру Альвінг застаецца са скалечаным жыццём у мінулым і з звар'яцелым сынам у будучым.

Гэта сумны вынік «падпарадкавання» абавязку паводле догмы паказной маралі.

Пастаноўшчык спектакля засл. арт. рэсп. С. Э. Радлоў робіць зусім правільна, калі акцэнтуе ў пастаноўцы на драме фру Альвінг, а не на трагедыі Освальда (за грахі бацькоў).

Трэба таксама сказаць, што і ўдзельнікі паказу ў абсалютнай большасці справіліся з пастаўленай перад імі п'есай і пастаноўшчыкам задачай выкрыцця маны дробнабуржуазнай маралі.

Засл. арт. рэсп. Т. Е. Якабсон у ролі фру Альвінг стварае вельмі пераканаўчы характар зморанай доўгімі годамі пакут жанчыны, якая хутчэй стараецца падвесці апошнія вынікі мінулага этапа жыцця. У жэстах, у хадзе, у інтанацыях фру Альвінг — Т. Е. Якабсон са значным майстэрствам перадае гэта вызваленне ад пут мінулага і радаснае, але нясмелае хваляванне маці, якая зноў можа абняць сваё дзіця, матчын непакой за некалькі незразумелыя ёй праявы ў паводзінах сына, ціхую радасць, калі яны пачынаюць разумець адзін аднаго, і над усім гэтым суровую мудрасць пражыўшага цяжкое жыццё чалавека. Але ў прадапошняй сцэне фіналу драмы, калі фру Альвінг даведваецца аб пагрозе, якая стаіць перад Освальдам, артыстка губляе ўнутраную напоўненасць. У гэтай сцэне Т. Е. Якабсон перадае не пачуцці фру Альвінг, але знадворны вынік матчыных у дадзенай сітуацыі пачуццяў. Не дапамагае Т. Е. Якабсон у фінале драмы ўдалая пабудова раду мізансцэн, якія значна палягчаюць ёй выкананне ролі. Нават гэта каштоўная рэжысёрская дапамога не выратоўвае артыстку. Глядач перастае ёй верыць і з дакукай слухае яе апошняе: «Не магу!»

Засл. арт. рэсп. Д. М. Дуднікаў вельмі стрымана і тактоўна выконвае ролю Освальда. Да заслугі артыста трэба аднесці адсутнасць паталагізму, небяспека чаго заўсёды стаіць перад выканаўцам ролі Освальда. Д. М. Дуднікаў здолеў знайсці рад вельмі скромных сцэнічных сродкаў, якімі ён поўнасцю перадае душэўны і фізічны стан Освальда. І толькі ў фінальнай сцэне непатрэбнай рэзкасцю рухаў і крыкам парушае ён чоткі мастацкі малюнак вялікага драматычнага напружання пры знадворнай стрыманасці. Артыст не павінен забывацца на тое, што Освальд—чалавек высока развітага інтэлекту і што самыя моцныя па драматызму душэўныя парывы яго павінны выяўляцца вельмі войстрымі, але разам з тым і вельмі ашчаднымі па сваёй стрыманасці сродкамі.

Арт. Антаневіч вельмі шчыра перадае характар пастара Мандэрса. Стары друг і душапрыказчык сям'і Альвінгаў, некалькі мітуслівы і разгублены; гарачы блюсціцель маралі; наіўны і шчыры да моманту, пакуль самому не пагражае небяспека сутычкі з грамадскімі поглядамі, накіраванымі супроць яго; «вялікае дзіця» у суадносінах з хітрым і амаральным эгаістам Энгстрандам...

Для ўсіх гэтых якасцей характару Мандэрса арт. П. Р. Антаневічам знойдзены не вельмі багатыя па сваёй разнастайнасці, але ў поўнай меры шчырыя фарбы сцэнічнага выканання.

Спрэчным у выкананні П. Р. Антаневіча можа быць толькі адно месца — дыялог з фру Альвінг, у якім пастар Мандэрс выступае як прамоўца-прапаведнік. Магчыма, у гэтай сцэне яму лепш было-б быць духоўным айцом-настаўнікам. Тым больш, што тэкст п'есы дае падставы думаць, што Мандэрс не зусім роўнадушны да фру Альвінг, як да жанчыны. А пры такой сітуацыі псіхалагічна, бадай, больш правільнай была-б якраз большая цеплыня, якая разам з тым у агульнай сітуацыі драмы больш падкрэслівала-б аб'ектыўную фальш гэтай задушэўнасці.

Засл. арт. рэсп. Г. І. Ерамееў (Энгстранд) стварыў вельмі ўдалы характар эгаістычнага ліцамера. Сваім выкананнем Г. І. Ерамееў прымушае гледача ні на мінуту не забываць, што кожнае слова, кожны рух, позірк Энгстранда—мана, накіраваная на паляпшэнне свайго дабрабыту. І калі Г. Ібсен у характары Энгстранда стварыў вельмі пераканаўчы вобраз сучаснага яму Тартюфа, то артыст Г. І. Ерамееў гэты вобраз цалкам давёў да гледача.

Зусім выпадае з ансамбля Рэгіна ў выкананні засл. арт. рэсп. В. В. Сашальскай. Нельга сказаць, што ў яе няправільны псіхалагічны рысунак ролі, ці што ў артысткі нехапае сцэнічных сродкаў. Але тое, што стварае В. В. Сашальская, зусім не Рэгіна. Ні голас, ні жэсты, ні знадворны выгляд артысткі нічым не адпавядаюць уяўленню аб васемнаццацігадовай дзяўчыне — Рэгіне.

Нам здаецца, што ў мастацкім калектыве тэатра ёсць не адна артыстка, якая і па галасавых даных і па знадворнаму выгляду больш падышла-б да выканання ролі Рэгіны.

Афармленне мастака В. С. Басава не бліщчыць вынаходлівасцю, але ў дастатковай меры стварае ўражанне аб стылевых асаблівасцях дома Альвінгаў і дапамагае, асабліва ў частцы святла, настраёвасці спектакля.

Падсумоўваючы агульныя ўражанні ад спектакля, трэба сказаць, што ён зладжаны, цалкам ускрывае ідэйную сутнасць ібсенаўскай драмы, стылёва цэльны і карыстаецца ў гледача заслужаным поспехам.

АЛЕГ СОЖЫН.

АБ ДРЭННЫХ КІРАЎНІКАХ І ЗАБЫТЫХ МУЗЕЯХ

Віцебскі гістарычны музей створан пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі 1917 года. У 1925 годзе пад музей была адведзена частка будынка былой гарадской управы і думы, дзе музей знаходзіцца і зараз. Фонды музея скаліся з існаваўшых да рэволюцыі музейных калекцый, матэрыялаў архіўнай камісіі, царкоўна-археалагічнага музея, калекцый Брадоўскага і інш. За час з 1925 года фонды музея значна папоўніліся і колькасць экспанатаў дасягае зараз 30.000.

Музейныя калекцыі выключна ярка характарызуюць мясцовы быт і мінулую культуру Беларусі, даюць багатае ўяўленне аб дагістарычным і гістарычным мінулым БССР, аб рэволюцыйнай барацьбе працоўных Беларусі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Калекцыі прадметаў выяўленчага і прыкладнога мастацтва, калекцыі зброі, манет складаюць вялікую каштоўнасць.

Не гледзячы на ўсё гэта, Віцебскі гістарычны музей, які па свайму зместу мог-бы мець рэспубліканскае значэнне, застаецца ў дрэнных умовах. Арудаваўшыя доўгі час у музеі нацдэмы, ворагі народа давялі музей да становішча, пры якім ён пастановай мясцовых партыйных органаў быў закрыт у 1937 годзе для поўнай рэканструкцыі. Цяперашняму складу работнікаў музея экспанаты дасталіся ў вельмі дрэнным становішчы. Калекцыі аказаліся разрозненымі. Навуковых апісанняў не было, інвентарныя опісы мелі назвы, якія не дакладна вызначалі прадмет, а часам і зусім не адпавядалі сапраўднасці. Сістэмы хавання ніякай не было, рэчы валяліся звалены ў кучу, як хлам.

Што можна было зрабіць, атрымаўшы фонды музея ў такім становішчы?

Тэрмінова былі створаны элементарныя ўмовы, якія дазволілі адкрыць музей у 1938 годзе. Старанная праца некаторых працаўнікоў музея, якія аказаліся выпадковымі аматарамі гэтай справы, дала свае рэзультаты. Музей завяваў увагу мас. Штодзённая наведваемасць музея складае ў сярэднім 200—250 чалавек, у выхадныя дні ў музеі бывае да 700 чалавек. На працягу года прачытана больш 1000 лекцый на розныя гістарычныя тэмы. У музеі шырока разгорнута агітмасавая работа і работа па вывучэнню гісторыі ВКП(б) і гісторыі СССР. Наведвальнікі палюбілі музей і, адносячыся да яго з увагай, прад'яўляюць усё большыя і большыя патрабаванні, уносяць істотныя рацыяналізатарскія прапановы. Нельга не выконваць гэтых патрабаванняў, нельга не выкарыстоўваць гэтых рацыяналізатарскіх прапаноў, але кіраўніцтва музея сустракае на сваім шляху шмат такіх перашкод, ад якіх міжволі апускаюцца рукі.

У мясцовых кіруючых органах па-ранейшаму не зжыта думка, што музей— апошні ўчастак работы. Памяшканне, якое не пашыралася на працягу 14 год, цеснае для музея; 50 процантаў экспанатаў застаюцца не выстаўленымі для агляду, а перыядычная змена выстаўляемых экспанатаў патрабуе вялікіх грашовых выдаткаў. Бюджэт музея пабудаван так, што не дае ніякай магчымасці разгарнуць як след навукова-даследчую і агітмасавую работу ні ў самім музеі, ні на тэрыторыі вобласці. Велізарная колькасць мастацкіх рэчаў не можа быць вывучана і выстаўлена з-за адсутнасці бюджэтных асігнаванняў.

Перайменаванне музея ў абласны не дало музею ніякіх пераваг і паляпшэнняў. Бюджэт застаўся мінулагодні, весці работу ў абласным маштабе няма сродкаў. Функцыі абласнога музея і яго абавязкі ў адносінах да вобласці невядомы. На тэрыторыі вобласці ёсць краязнаўчыя музеі ў Полацку і Оршы, ёсць музеі пры некаторых школах, можна было-б арганізаваць перасоўныя выстаўкі. Але хто павінен кіраваць музейнай справай у вобласці—невядома, між тым кіраўніцтва ёю на паперы забяспечана, бо акрамя абласнога музея ў вобласці ёсць інспектар музейнай справы пры аблАНА і ёсць метадыст музейнай справы пры Наркамасветы.

Прыказка кажа, што ў сямі нянек дзіця бывае без носа. У такое становішча трапіла і музейная справа ў Віцебскай вобласці. Усе кіруюць ёю, а працаваць няма каму. Метадысту і інспектару дадзены магчымасці кіраваць, але яны адарваны ад музейнай справы і не маюць музейных ведаў; у працаўніка абласнога музея ёсць веды, але няма матэрыяльных магчымасцей для кіраўніцтва.

Вось узор папяровага кіраўніцтва Наркамасветы БССР музейнай справай. У вывадах ад 14—18 красавіка гэтага года метадыст музейнай справы прапаноўвае Аршанскаму музею «разгарнуць навукова-метадычную працу» і скласці план працы музея, выходзячы з раздзелаў: а) гісторыка-рэволюцыйнага, б) сельскагаспадарчага, в) прамысловага, г) прыроды, д) соцыялістычнага. Паказаць мінулае ў кожным раздзеле і да Кастрычніцкай рэволюцыі і пасля Кастрычніцкай рэволюцыі. Такіх раздзелаў не даецца ўжо ні ў адным музеі СССР, а тым больш у краязнаўчым музеі, у якім няма ні сіл, ні сродкаў для распрацоўкі такіх праблем і дзе справу трэба было арганізаваць як можна прасцей.

Віцебскаму музею метадыст прапанаваў уключыць у экспазіцыю матэрыялы мясцовага значэння, а ў раздзелы феадалізма ўключыць рэволюцыйны рух сялянства на Віцебшчыне напярэдадні рэформы 1861 года. Абследуючы наш музей, метадыст не пазнаёміўся нават з яго структурай, інакш ён убачыў-бы, што рэволюцыйны рух 1861 года ўключан у нас у экспазіцыйны план раздзела «Новай гісторыі», куды ён храналагічна павінен быць аднесен. Калі-б метадыст бліжэй пазнаёміўся з экспазіцыяй музея, ён убачыў-бы таксама, што апошняя пабудавана выключна на мясцовым музейным матэрыяле.

Музейныя метадысты і кіраўнікі зусім не цікавяцца такімі фактамі, што музей не можа зрабіць інвентарных кніг з-за адсутнасці паперы, што музей не можа ахоўваць свае экспанаты з-за недахопу вартавых, што музей не можа ўкамплектаваць свой штат з-за нізкіх ставак заработнай платы музейных працаўнікоў, стаўкі якіх ніжэй ставак работнікаў мясцовых установ.

Затое музейныя метадысты і кіраўнікі шлюць нам мора папер аб арганізацыі такіх перыядычных выставак, якія музей арганізоўвае і без іх указанняў. Часта яны толькі збіваюць з панталыку арганізатараў выставак, даючы ім няправільныя ўстаноўкі.

Патрэбна карэнная рэформа музейнай справы. Яна наспела і, магчыма, пачалася з таго, што ахова помнікаў гісторыі, мастацтва і рэволюцыі перададзена Упраўленню па справах мастацтваў. Аднак, гэта рэформа ў Віцебскай вобласці адчувальных рэзультатаў пакуль-што не дае. Калі на працягу мінулых год, у якія помнікі культуры былі беспрытульнымі, у нас у Віцебску аказаліся разбуранымі такія пабудовы стылю барокка, як Успенскі сабор, пабудаваны 200 год назад італьянскім архітэктарам Фантано, Васкрэсенская царква і інш., дык у сучасны момант, калі ахова помнікаў знаходзіцца ў руках Упраўлення па справах мастацтваў, стыхійнае разбурэнне іх прадаўжаецца: чатыры мраморных мастацкіх камені ад помніка ў памяць боя рускіх войск з Напалеонам пад Віцебскам узяты для патрэб мясцовай фабрыкі, а марціры і ядры айчыннай вайны 1812 года зніклі невядома куды. Прыходзілася бачыць, як хлапчукі качалі ядры па гораду.

Галерэя Пэна адкрыта ў Віцебску, аднак з 800 работ мастака выстаўлена толькі 72. Астатнія работы хаваюцца ў кладовай. Памяшканні карціннай галерэі і кладовай зусім не прыгодны для гэтай мэты; афармленне выстаўкі жадае шмат лепшага.

У Віцебску можна было-б адкрыць у адным з закрытых касцёлаў ці цэркваў антырэлігійны музей. Неабходнасць у такім музеі адчуваецца, магчымасці ёсць вялікія. У кладовых гістарычнага музея хаваецца шмат экспанатаў розных рэлігійных культаў, якія бытавалі на тэрыторыі Беларусі. Але аб адкрыцці антырэлігійнага музея ў Віцебску ніхто не клапоціцца.

І. І. ВАСІЛЕВІЧ.

Старшы навуковы работнік Віцебскага абласнога гістарычнага музея.

Па слядах нашых выступленняў

За апошні час газеты «Звязда», «Літаратура і мастацтва» і «Віцебскі рабочы» сігналізавалі аб нядбайных адносінах да помнікаў гісторыі і мастацва, што мелі месца па Віцебскай вобласці. Адначасова прыводзіліся факты пастаноўкі новых помнікаў, абураючых сваёй немастацкасцю,—напрыклад, помнік вялікаму Пушкіну ў Віцебску. І, нарэшце, адзначалася аб амаль поўным знікненні магілы слаўнага мастака Ю. М. Пэна.

Віцебскае абласное ўпраўленне па справах мастацтваў стварыла камісію па ахове помнікаў гісторыі і мастацтва. У бліжэйшы час члены камісіі выедуць на раёны вобласці для абследвання гэтых помнікаў і ўзяцця на падлік усіх магіл герояў народных паўстанняў, рэволюцыі, грамадзянскай вайны і акупацыі.

У спецыяльнай пастанове Аргкамітэт Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Віцебскай вобласці прапанаваў Полацкаму горсовету аслабаніць выдатнейшы помнік гісторыі і мастацтва—будынак б. Сафійскага сабора ад склада «Заготзярно» і перадаць яго мясцоваму гістарычнаму музею. Віцебскаму горсовету Аргкамітэт прапанаваў тэрмінова аднавіць помнік 1812 года ў ранейшай кампазіцыі, установіць на Пушкінскім скверы новую скульптуру геніяльнага Пушкіна і прыняць меры да захавання магілы Ю. М. Пэна.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка, Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Б—1341.